Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# ЗВЕЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЛЮТЫ 4 1934 г. НЯДЗЕЛЯ № 29 (4862) Год выдання XVII

*Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!*

## 2. РЭЗАЛЮЦЫЯ XVII З'ЕЗДА ВКП(б) ПА СПРАВАЗДАЧНАМУ ДАКЛАДУ тав. МАНУІЛЬСКАГА АБ РАБОЦЕ ДЭЛЕГАЦЫІ ВКП(б) у ВКНІ

(прынята аднагалосна)

*Заслухаўшы справаздачу дэлегацыі ВКП(б), у Камінтэрне, XVII з'езд ВКП(б) цалкам і поўнасцю ўхваляе палітычную лінію і практычную работу дэлегацыі ВКП(б) у Камінтэрне.*

XVII З'ЕЗД ВКП(б)

СПРЭЧКІ ПА СПРАВАЗДАЧНАМУ ДАКЛАДУ ТАВ. СТАЛІНА АБ РАБОЦЕ ЦК ВКП(б)

# Даклад тав. СТАЛІНА—праграма ўсёй нашай работы

## *Прамова тав. КІРАВА*

Таварышы! Мы падводзім выні- ці работы нашай партыі і нашага Цэнтральнага Камітэта за перыяд часу ў 3.5 гады. Я думаю, таварышы, што самым кароткім выражэннем заместу нашай работы за гэты прамежак часу з'яўляецца тое, што мы даказалі практычна (тэарэтычна гэта было ўстаноўлена партыяй значна раней) магчымасць перамог шага будаўніцтва сацыялізма ў нашай, асобна ўзятай, краіне і прыйшлі к XVII з'езду з найвялікшымі перамогамі.

Магчымасць пабудовы сацыялізма ў адной краіне—формула сама па сабе вельмі кароткая, і цяпер яна радах партыі не выклікае ні ў кім ніякіх сумненняў. Але, калі спомніць, які шлях быў перад нашай перамогай, дык стане ясным, якую выключную ролю адыграла наша партыя, якую выключную барацьбу вынес пад кіраўніцтвам нашай партыі рабочы клас у справе жыццяўлення ленінскага плана будаўніцтва сацыялізма ў адной краіне.

Бо, калі ўспомніць, таварышы, тое, што мы ўнутрыпартыйныя спрэчкі, то ў канчатковым выніку, усе мы і барачаліся, вакол гэтай асноўнай восі, вакол рашаючага для пролетарскай рэволюцыі пытання аб магчымасці будаўніцтва сацыялізма асобна ўзятай краіне. Праўда, не адсёды і не ўсюды атакуючыя генеральную лінію нашай партыі прадстаўнікі правых, «левых» і лева-правых апартуністаў адкрыта выказвалі свае сумненні адносна гэтай асноўнай тэмы. Але мы ведаем, што з якога-б боку ні пачыналася атака на генеральную лінію нашай партыі, у канчатковым выніку, расшыфроўваючы гэту атаку, мы заўсёды бачылі, што ў корані яе ляжыць пытанне аб магчымасці пераможнага будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне.

Зараз, паўтараю, гэта пытанне вы- нашана для нас не толькі тэарэтычна, але і практычна. Мы маем не толькі каласальныя заваяванні ў праве нашай прамысловасці, у жыццяўленні ленінскага лозунга індустрыялізацыі нашай краіны, але мы за гэтыя 3.5 гады рашучым чынам павярнулі многамільённую адасобную сялянскую гаспадарку на новыя сацыялістычныя рэйкі.

Сацыялістычная перабудова дробна-буржуазнай сялянскай гаспадаркі была самай труднай, самай цяжкай і самай складанай праблемай для пролетарскай дыктатуры ў яе барацьбе за новае сацыялістычнае грамадства. Іменна гэта праблема, іменна гэта так званае сялянскае пытанне і параджала ў галовах апа- ніцыянераў сумненні ў магчымасці пераможнага будаўніцтва сацыялізма ў нашай краіне. Гэта найталоўнейшае пытанне пролетарскай рэволюцыі вырашана цяпер беспаваротна і канчаткова на карысць сацыялізма.

У выніку ўсёй нашай работы мы з даньней стадыі нашага развіцця маем такое ўмацаванне дыктатуры рабочага класа ў нашай краіне, якога мы не мелі ніколі. Мы маем зараз сапраўды моцна наладжаную моцна сцементаваную нашу вялікую савецкую дзяржаву, стварыўшую фундамент сацыялістычнай эканомікі. Гэта дае велізарнае матэрыяльнае задавальненне не толькі рабочаму класу, многамільённаму сялянству нашай краіны, але гэта з'яўляецца ленінскім агітарам, самым моцным прапагандыстам за справу сацыялізма за межамі нашай краіны, сярод міжнароднага пролетарыята, сярод усіх прыгнечаных Усхода і Захада.

Мне, таварышы, здаецца, што многія з нас недастаткова ўлічваюць вынікі той работы, якую мы праробілі за апошнія 3 з пал. гады. У гісторыі часта бывае так, што для таго, каб апаніць тое, што было праведзена гістарычна ўчора, трэба дабіцца на даволі вялікую гістарычную адлегласць, паглядзець здаляка на тое, што мы зрабілі.

Самым яркім і самым поўным дакументам, які мы ведаем да сёнешняга дня, які нарысаваў перад нашай усю карціну нашай вялікай сацыялістычнай будоўлі за тры з паловай гады, з'яўляецца справаздачны даклад т. Сталіна на гэтым з'ездзе. **(Апладысменты).**

Я думаю, не будзе таксама перабольшэннем сказаць, што мы яшчэ не падышлі да таго часу, калі мы дасканала поўнасцю, да кожнай косці, разбярэмся ва ўсім тым, што нам сказаў тут т. Сталін.

**Галасы:** правільна.

**Кіраў:** У яго дакладзе быў не толькі вынік праробленай намі работы. Тав. Сталін даказаў нам шляхам глыбачайшага марксісцка-ленінскага аналіза, **як мы гэтаго дасягнулі,** чаму мы гэтага дабіліся. Тав. Сталін не абмежаваўся справаздачнай справай свайго даклада, ён разгарнуў перад намі гіганцкія перспектывы работы па бліжэйшыя гады, гэту новую сторонку нашай вялікай праграмы. І больш таго, таварышы, там не толькі нарысована, паказана праграма гэтай работы. Тав. Сталін нам сказаў, **як трэба** ажыццяўляць праграму, як трэба далей умацоўваць і памнажаць нашу сацыялістычную будоўлю.

Мне, таварышы, здавалася-б, што ў выніку такога падрабязнага абгаварання даклада ЦК нашай партыі, якое мела месца на гэтым з'ездзе, было-б дарэмна ламаць галаву над пытаннем аб тым, якое вынесці рашэнне, якую вынесці / рэзалюцыю па дакладу т. Сталіна. Будзе больш правільна, памойму, і для справы, ва ўсякім выпадку гэта будзе больш мэтазгодна, чым усякае другое рашэнне,—гэта прыняць да выканання, як партыйны закон, усе палажэнні і вывады справаздачнага даклада т. Сталіна.

**Галасы:** Правільна. **(Бурныя доўгія апладысменты).** Усе ўстаюць, апладыруючы.

Але гэтага мала, таварышы. Аднаго гэтага далёка яшчэ недастатко ва для поспеху далейшай работы. Прынцып—гэта адно, а другое—трэба будзе гарантаваць нам усім аўтарытэтам нашага вялікага з'езда сапраўднае, поўнае, чэснае, большэвіцкае выкананне ўсяго таго, што тут было сказана т. Сталіным. **(Бурныя апладысменты, выгукі: Правільна).**

Таварышы, у выніку ўсёй работы паміж XVI і XVII з'ездамі мы бачым, якая аграмадная перабудова ўсёй народнай гаспадаркі адбылася ў нашай краіне, якая аграмадная перасоўка ў размеркаванні сацыяльных сіл адбылася ў нас на карысць сацыялізма.

Ва ўсіх звеннях нашай сацыялістычнай будоўлі зараз пераважае сацыялістычны прынцып. І вось у такой-та абстаноўцы, пры такіх-та выніках, здавалася, ці варта-б было спыняцца на выступленнях, якія мы чулі тут з боку былых лідэраў правай і трацкісцкай апазіцыі?

З'езд без асаблівай увагі слухаў выступленні гэтых таварышоў, і вось, мне здаецца, што да гэтых выступленняў трэба ўжо цяпер падыйсці не толькі з пункту гледжання тэарытычнага,—мы гэтыя справы дыскусавалі ўжо цэлы рад год таму назад **(галасы: Правільна),** але трэба некалькі больш практычна, так сказаць, па-чалавечаму глянуць на тое, што адбылося з правадырамі былых апазіцыйных груповак. Не ўдаючыся ў тэарытычны аналіз поглядаў усякага роду апазіцый, якіх яны і самі цяпер не абараняюць, мне хацелася-б скарыстаць прысутнасць тут ваенных і ўявіць сабе, скажам, такую карціну. Мы з вамі—наша вялікая комуністычная армія пад аўтарытэтным камандваннем Цэнтральнага Камітэта нашай партыі, узначальваемага такім найвялікшым стратэгам сацыялістычнай будоўлі, як т. Сталін—мы павялі рашучае сацыялістычнае наступленне па ўсяму фронту. Мільёны рабочых, з імі ў саюзе яшчэ большыя мільёны сялян, на чале з цвёрдай, жалезнай, сталёвай ленінскай партыяй пашлі ў бой. У гэтым баю, таварышы, нам прышлося пацярпець не мала паасобных няўдач і няўзгод, але ў выніку мы вышлі к XVII з'езду партыі на такія новыя пераможныя вышыні, што ўсе гэтыя дэфекты, і ўсе гэтыя недахопы тушыюцца перад веліччу нашых перамог.

Але вы ведаеце, таварышы, што ва ўсякай вайне, а ў тым ліку, аказваецца, і ў той вайне, якая вядзецца за будаўніцтва сацыялізма, здарылася так, што паасобныя таварышы з розных прычын пачалі сумняванца ў мэтазгоднасці і паспяховасці таго вялікага паходу, які мы разгарнулі, і замест таго, каб біцца ў радах асноўных байцоў, яны, то ў адзіночку, то цэлымі групамі нават з кіруючых радоў, часам або ныралі ў бок, або адставалі ці скрываліся ў абозе, або яшчэ дзе-небудзь, не гледзячы на тое, што па фізічных якасцях ім было месца ў перадавой лініі агня. А армія ідзе, бо гэта ніякім чынам хістаць баязлівую армію не павінна і не можа. Армія ідзе наперад, атрымліваючы адну перамогу за другой. Але там, у абозе, сярод гэтых паасобных хістскіх груп, звеньняў і групачак, усё-такі ідзе своя работа. Атрымліваючы загады камандвання, гэтыя людзі не толькі не стараюцца праводзіць гэтыя загады, наадварот, яны ўсяляк стараюцца падарваць аўтарытэт гэтых загадаў, яны ўсяляк стараюцца расхістаць бліжэйшыя да іх шарэнгі.

Справа даходзіць да таго, як здараецца і па вайне, што праціўнік, заўважыўшы наяўнасць празмерная колькасці такіх «абозных» элементаў, пачынае нават некаторыя разлікі трымаць на гэтыя пласты арміі. А барацьба ідзе, армія атрымлівае адну перамогу за другой. І вось уявіце сабе карціну,—пасля таго, як армія атрымала рашаючыя перамогі над ворагам,—асноўныя пазіцыі заняты, вайна яшчэ не скончылася, далёка не скончылася, але наступіла нешта накшталт пераможнай перадышкі, калі можна так сказаць, і вось уся, вялікая пераможная рацэ байцоў пяе магутную пераможную песню. І ў гэты час, што застасцца рабіць усім тым, якія да сёнешняга дня былі ў абозе? **(Апладысменты, смех).**

Яны, таварышы, выходзяць, працягваюць таксама ўклініцца ў гэта агульнае таржаство, працягваюць у нагу пайсці, пад адну музыку, падтрымаць гэты наш пад'ём. Але як яны ні стараюцца, не выходзіць і не атрымліваецца. **(Смех, апладысменты).**

Вось, вазьміце Бухарына, напрыклад. Памойму, пяяў як быццам па нотах, а голас не той **(Смех, апладысменты).** Я ўжо не гавару аб тав. Рыкаве, аб тав. Томскім.

**Ройзенман:** Так, так.

**Кіраў:** Тут нават і мелодыя другая **(Смех, апладысменты).** І ў тон не попадаюць, і ў крок не паспяваюць.

І я пачалавечаму, таварышы, паду- маю, не будзе таксама перабольшэннем сказаць, што мы яшчэ не падышлі да таго часу, калі мы дасканала поўнасцю, да кожнай косці, разбярэмся ва ўсім тым, што нам сказаў тут т. Сталін.

**Галасы:** правільна.

**Кіраў:** У яго дакладзе быў не толькі вынік праробленай намі работы. Тав. Сталін даказаў нам шляхам глыбачайшага марксісцка-ленінскага аналіза, **як мы гэтаго дасягнулі,** чаму мы гэтага дабіліся. Тав. Сталін не абмежаваўся справаздачнай справай свайго даклада, ён разгарнуў перад намі гіганцкія перспектывы работы па бліжэйшыя гады, гэту новую сторонку нашай вялікай праграмы. І больш таго, таварышы, там не толькі нарысована, паказана праграма гэтай работы. Тав. Сталін нам сказаў, **як трэба** ажыццяўляць праграму, як трэба далей умацоўваць і памнажаць нашу сацыялістычную будоўлю.

Мне, таварышы, здавалася-б, што ў выніку такога падрабязнага абгаварання даклада ЦК нашай партыі, якое мела месца на гэтым з'ездзе, было-б дарэмна ламаць галаву над пытаннем аб тым, якое вынесці рашэнне, якую вынесці / рэзалюцыю па дакладу т. Сталіна.

Будзе вінен сказаць, што гэта не так проста, трэба ўвайсці ў становішча людзей, якія цэлыя гады, рашаючыя гады напружанейшай барацьбы партыі і рабочага класа сядзелі ў абозе.

**Ройзенман:** Абознікі, абознікі.

**Кіраў:** Ім вельмі цяжка стаць на партыйныя пазіцыі. І мне здаецца, я не хачу быць прарокам, але яшчэ некаторы час пройдзе, пакуль уся гэта абозная рацэ ўвальецца ў нашу пераможную комуністычную армію. **(Апладысменты).**

**Ройзенман:** Брава, брава.

**Кіраў:** Таварышы, мы называем свой з'езд з'ездам пераможцаў. Гэта верна. Але вот з усяго таго, што я стараўся папросту расказаць, вельмі элементарна, памойму гэта правільна, так сказаць, па сутнасці **(Апладысменты),** мне здаецца, што з усяго гэтага трэба зрабіць неабходныя вывады іменна таму, што барацьба не кончылася, барацьба прадаўжаецца.

Наперадзе ажыццяўленне той праграмы, якую нам нарысаваў т. Сталін.

Наперадзе яшчэ вельмі многа кло- патаў і турбот для ўсёй партыі, для кожнага з нас і для ўсяго рабочага класа. І можа яшчэ здарыцца, што таму-сяму, паасобным таварышам, а можа быць, паасобным групам, зноў прыдзецца ў чым-небудзь расчаравацца, гэта не выключана. Вось чаму, з таго прыкладу, які я вам прывёў, мы павінны вынесці ўрок у тым сэнсе, што нам неабходна і надалей захоўваць у нашых радах, у радах нашай комуністычнай партыі найвялікшую, найглыбейшую партыйную пільнасць і жалезную большэвіцкую дысцыпліну. Тое, што мы перамаглі, тое, што зараз гэтыя-разбітыя апазіцыянеры, так гэта, вечаце, прабуюць усялякім падладзіцца да нашых перамог, гэта яшчэ ні ў якай ступені, таварышы, не вінмае з парадку дня пытання аб тым, што нам у далейшым трэба берагчы чыстату і непарушнасць генеральнай лініі нашай партыі. **(Апладысменты).**

Я, паўтараю,—наперадзе, таварышы, яшчэ вельмі многа вельмі цяжкіх і вельмі складаных пытанняў і ўнутранага і знешняга парадку, якія нам прыдзецца вырашаць.

## Горад Леніна вытрымаў экзамен

Я з'яўляюся прадстаўніком так званага старога прамысловага раёна працуючага на справу сацыялістычнай будоўлі. Але мне здаецца, што, калі мы на XVI з'ездзе партыі надзялілі нашы прамысловыя раёны па старыя і новыя, то на XVII з'ездзе нашай партыі мы маем шмат падстаў для таго, каб адмовіцца ад гэтага падзелу. Тут ужо шмат гаварылася, — я паўтараць не буду,—якія гіганцкія работы, якія гіганцкія поспехі мы маем у справе сацыялістычнай будоўлі ў новых раёнах. І разам з тым трэба сказаць, што і так званыя, старыя раёны за гэтыя тры з паловай гады перасталі быць старымі.

У нас, напрыклад, ленінградскія рабочыя гавораць, што ў Ленінградзе засталіся старымі толькі слаўныя рэволюцыйныя традыцыі пецярбургскіх рабочых, усё астатняе стала новым **(Апладысменты).**

І гэта, таварышы, сапраўды так. Калі ўзяць нашу прамысловасць, то за справаздачны прамежак часу, дакладней, за тры гады (я не буду затрудняць вас лічбамі), мы асноўныя фонды ленінградскай прамысловасці павялічылі на 70 з лішнім процантаў. Але тут мала гаварыць проста аб павялічэнні асноўных фондаў, аб рублях і аб колькасці варштатаў і абсталявання. Гаворачы аб абнаўленні нашых старых заводаў, трэба заўсёды мець на ўвазе якасны бок гэтага абнаўлення, бо новыя варштаты, якімі мы замяняем ранейшыя варштаты, нічога агульнага са старымі варштатамі не маюць: тыя агрэгаты, якія мы ставім зараз, яны карэнным чынам адрозніваюцца ад тых, якія былі раней. У выніку, вось такое абнаўленне нашай ленінградскай прамысловасці прывяло да таго, што, як гэта ні дзіўна, мы з XVI па XVII з'езд амаль захоўваем удзельную вагу ў валавой прадукцыі Совецкага Саюза, яна хістаецца ад 14 да 15 проц.. Але справа не толькі ў гэтым. Справа ў тым, што такія рашаючыя галіны прамысловасці, як машынабудаўніцтва, суднабудаўніцтва, электрабудаўніцтва і оптыка, г. зн. тыя галіны прамысловасці, якія з'яўляюцца вядучымі ў Ленінградзе, яны як былі, так і застаюцца на ранейшым высокім узроўні. Напрыклад, уся металургічная прамысловасць вырасла за тры гады ні многа, ні мала як на 92 з лішнім процанта. Я гэта вяду к таму, што гэтага не было-б, калі-б мы своечасова не здолелі абнавіць рашучым чынам наш асноўны капітал, які мы маем у нашай ленінградскай прамысловасці.

Нельга абыйсці маўчаннем і ролю Ленінграда, як магутнай кавальні кадраў для нашых новых сацыялістычных будоўляў і навукова-даследчых устаноў усяго Совецкага Саюза. У 1932-1933 годзе мы пакінулі за межы нашай вобласці 7.500 кваліфікаваных работнікаў.

Гэта не значыць, што ў нас няма ніякіх недахопаў і ніякіх дэфектаў у нашай рабоце. Не гледзячы на велізарны вопыт, які мае Ленінградская прамысловасць, ленінградскія рабочыя, не гледзячы на аграмадныя рэволюцыйныя традыцыі, і ў нас недахопаў, дэфектаў яшчэ вельмі і вельмі многа. Але ў асноўным горад Леніна вытрымаў той экзамен, які Цэнтральны Камітэт партыі прад'явіў яму, і паспяхова справіўся з ускладненымі на яго задачамі па ўзбраенню перадавым тэхнічным абсталяваннем важнейшых новых будоўляў і рашаючых галін прамысловасці ўсяго Совецкага Саюза.

Уперадзе, таварышы, у нас у перспектыве бліжэйшых год аграмадныя задачы ў далейшым развіцці нашай прамысловасці.

Я-бы хацеў звярнуць увагу на адзін бок справы, які вельмі затрудняе далейшы рост Ленінградскай прамысловасці.

Гэта пытанне аб нашых апалавых рэсурсах. Вы ведаеце, на якой адлегласці знаходзіцца ленінградская прамысловасць ад нафты і ад вугалю. Стараліся мы з усіх сіл у асаблівасці пад націскам тав. Сталіна, знайсці хоць які-небудзь гаручы матэрыял у нашай вобласці, ці ў нас на поўначы, але да гэтага часу пакуль што гэта справа безрэзультатна. Але ў нас ёсць — і не толькі ў нас, а і на ўсёй поўначы — велізарныя запасы торфу, на здабычу якога мы, ленінградцы, і нашы суседзі, якія жывуць у тарфяных месцах, патрэбнага напору не праяўлялі. Колькасна, праўда, мы дабываем яго непараўнальна больш, чым гэта было раней.

Пры цары ленінградская прамысловасць жывілася не мясцовым вугалем і нават не данецкім, а англійскім апалам жывілася. Зараз мы пераключыліся на наш совецкі апал.

У апошні час нам удалося дабіцца значных рэзультатаў у справе больш мэтазгоднага скарыстання тарфянога апалу. Я маю на ўвазе, таварышы, прыстасаванне топак для добрага прадукцыйнага спальвання так званага фрэзернага торфу. Мы маем зараз новыя, праверраныя не толькі лабараторнымі доследамі, але і фабрычна-заводскім шляхам новыя топкі праф. Макар'ева для спальвання фрэзернага торфу. Гэта ўносіць цэлую рэволюцыю ў апаласнабжэнне нашай прамысловасці.

Вядома, што здабыча фрэзернага торфу куды лягчэй, чым здабыча якога-небудзь іншага віду торфу. Але далей ідзе цэлы рад пытанняў: як яго захоўваць ад самазапалвання і т. д. Усе гэтыя пытанні, мы, а таксама і іншыя вобласці, якія сядзяць на торфе, павінны будзем паставіць у цэнтр увагі сваёй гаспадарчай работы. Таварышы, ніякім чынам нельга пагарджаць гэтым відам апалу. Калі параўнаць яго з іншымі відамі апалу, то, вядома, нафтавы апал лепш і зручней, вядома, данецкі вуголь прыемней і т. д. Але, можна, таварышы, калі ўзяцца за торф як след, можна зрабіць аграмадную справу. Я ўжо не кажу аб перспектывах далейшага развіцця тарфянай прамысловасці, аб газіфікацыі і т. д. Я кажу аб задачах сёнешняга дня.

А запасы тарфянога апалу новы чарпальны. Тое, што мы ўзялі зараз у арбіту свайго нагляду, гаворыць аб тым, што мы не спальваем яшчэ і той колькасці торфу, якая нараджаецца ў нас божны год.

Другое, гэта разгортванне ў нас у Ленінградскай вобласці работы па здабычы сланцоў. Мы знайшлі за апошнія гады аграмадныя залежы сланцоў. Палохала нас некалькі тое, што ў 1932 годзе, узяўшыся шчыльна па за гэту справу, мы мелі цэлы рад ўсякага роду няўдач, звязаных з багацтвам грунтавых вод, залежах сланцоў, але зараз мы гэту справу перамаглі. Аграмадная будзе заваёта для прамысловасці нашай вобласці, калі мы справу сланцоў авоём, а мы павінны гэта зрабіць.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што мы знайшлі ў нашай вобласці на поўначы аграмадныя залежы жалезнай руды. Я не хачу вам назваць лічбы.

Жалеза там вельмі падыходзячае. Мы яго даследавалі ўсяляк і ў лабараторыях, і на заводзе і бачым, што гэта такое жалеза, якое па сваёй якасці (я нікога не хачу тут пакрыўдзіць) з любым раёнам можа паспрачацца і перапяцца. Але ўсё пытанне з выкарыстаннем гэтых жалезных руд упіраецца ў адсутнасць мясцовага апалу, неабходнага для металургіі.

Калі мы маем такі аграмадны, які дзесяткі год складваўся, прамысловы цэнтр і калі нам удасна сапраўды з заўтрашняга дня арганізаваць новую цвёрдую апалавую базу, і калі раскрываюцца такія прыродныя перспектывы, то падумайце, што тут выходзіць для далейшага развіцця не адной толькі ленінградскай прамысловасці. Нават на адным гэтым прыкладзе можна зразумець, у якіх неабсяжных межах на сацыялістычных асновах можа разгортвацца далейшы пад'ём прадукцыйных сіл. Тое, што ўчора здавалася зусім непрабудным, куды як гаварылі, «Макар цялят не ганяў», куды ў царскі час толькі ў ссылку людзей высылалі, цяпер там волей-няволей большэвікоў, на базе прыродных багацтваў (запасы, жалеза, маслякі, сланцы, торф, то рый, тытан і інш.), у поўтундры, куды да гэтага часу нага чалавечая не ступала, стаяць новы, хутка расцучы індустрыяльны цэнтр запалярнага круга.

Там-жа на поўначы, па шляхах ве т. Сталіна, пабудован Беламорска-Балтыйскі канал — гэта гіганцкая пабудова нашай эпохі. Вам раздалі тут кніжку аб Беламорска-Балтыйскім канале, абазначкова прачытайце яе, вельмі карысная кніжка. Такі канал, у такі кароткі тэрмін, у такім месцы ажыццявіць — гэта сапраўды гераічная работа, і трэба аддаць справядлівасць нашым тэхнікам, якія кіравалі гэтай справай, якія літаральна зрабілі чуда.

У выніку мы звязалі Белае мора з Балтыйскім і стварылі водны шлях праз Марыінскую сістаму, праз Волгу з Белага мора ў Каспійскае. А ў бліжэйшыя гады гэты вялікі водны шлях заверне ў нашу чырвоную сталіцу — Маскву. І украінцы заключаюць з намі саюз у тым, каб правесці новы водны шлях прама ад нас да Чорнага мора. Падумайце, як цесна звяжам мы наш вялікі і неабсяжны Совецкі Саюз сеткай рэк, каналаў і як праз іх злучым і ажывім неабітаемыя моры і акіяны.

Далей буйнейшай задачай для нас з'яўляецца стварэнне ў межах вобласці сваёй харчовай с.-г. базы. Тав. Сталін у сваім дакладзе ўказаў, што ў даны момант кожны прамысловы цэнтр павінен разлічваць у першую чаргу на выкарыстанне сваіх унутры-абласных харчовых рэсурсаў, бо цяпер няма ўжо больш чыста сельска-гаспадарчых абласцей, якія маглі-б ў ранейшых размерах снабжаць старыя прамысловыя раёны.

Усім вядома,—даравчы, тут многа старых піцерцаў сядзіць, — што да рэволюцыі Ленінград быў акружан крыху больш сельска-гаспадарчай тэрыторыяй. Усе вы ведаеце, што граніцы з суседнімі цэнтрамі прайшлі так, што многа сельска-гаспадарчых раёнаў ад нас адышло. І калі гаварыць аб мінулым, зусім нядаўнім мінулым, справа складвалася так, што не толькі мы, работнікі, якія жывуць у Ленінградзе, жылі прывозным хлебам, але і сяляне — показвічы. Ім хапала свайго хлеба да студзеня — лютага самае больш, а далей трэба было з іншых раёнаў завозіць. Цяпер мы дабіліся таго, што сяляне Ленінградскай вобласці ў прывозным хлебе не маюць патрэбы: больш таго, мы тое-сёе затаўляем і для дзяржавы. Але Ленінград не забяспечвае сябе хлебам і асабліва гародніной за кошт унутрыабласных рэсурсаў. Мы ставім задачай у 1934 г. — і тут ЦК нам усімі мерамі дапамагае — давесці сваю прадукцыю бульбы для задавальнення ленінградскіх рабочых у 1934 г. да 60 проц. і гародніны да 50 проц. Гэта вельмі вялікі рост у параўнанні з тым, што мы маем да гэтага часу. І цяжкавата прыдзецца цям. Але трэба ка-што-б там ні стала, побач з сыровай базай для прамысловасці, развіваць і нашу харчовую базу. Думаю, таварышы, што ў год гэтай справы мы не выраваным, але мы так ставім сабе: гадкі ў два — тры, калі вы нам крыху будзеце [illegible] год усё менш і менш, пачынае мы станем на свае ўласныя ногі і ў гэтых адносінах у нас няма ніякага сумнення.

Таварышы, я думаю, што дапамагчы нам трэба тым больш, што на нас ляжаць вельмі вялікія задачы. Вы ведаеце, што ў справе індустрыялізацыі Ленінград адыгрывае выключна адказную ролю: няма ні аднаго месца, няма ні аднаго кутка ў Совецкім Саюзе, куды-бы ні шла прадукцыя ленінградскай прамысловасці. Праўда, яна не заўсёды добраякасная, але гэта мы пастараемся зніштожыць. У параўнанні ўзаемаадносін асноўным с.-г. абласным прадпрыемствам пакуль што дапамагаць Ленінграду па частцы с.-г. прадукцыі, тым больш, што гэтаму слаўнаму гораду дапамагчы не грэх.

Таварышы, на днях споўнілася роўна дзесяць год з таго моманту, калі нашаму гістарычнаму гораду было прысвоена імя нашага вялікага настаўніка—Петраград быў перайменаваны ў Ленінград.

За гэтыя дзесяць год ленінградскія рабочыя і работніцы сваёй самаадданай барацьбой за генеральную лінію партыі паказалі, што яны варты імя горада Леніна, у якім яны жывуць і працуюць. І тут ужо скарыстаю выпадак і ад імя ленінградскіх рабочых паўнаю вам заявіць, што яны заўсёды былі не ў апошніх радах той вялікай барацьбы за сацыялістычную будоўлю, якую мы з вамі вялі. Яны і далей будуць адной з самых верных, самых непахісных і самых адважных калон партыі большэвікоў і яе Цэнтральнага Камітэта (Бурныя апладысменты).

Таварышы, мне хацелася-б, на аснове вопыту нашай ленінградскай прамысловасці заазначыць адно — два пытанні, якія датычаць, па-мойму, работы ўсёй прамысловасці Саюза.

Першае — гэта якасць нашай работы на нашых фабрыках і заводах.

Гэта — хворае месца, і я думаю, не толькі ў нас. У Ленінградзе, захапляцца ўсякімі 100-200 проц. колькаснага росту нам ніяк не прыходзіцца. Гэта ўсё вельмі добра, што колькасць расце, але якасць адстаўляе жадаць вельмі многага. Не таварыша-ж ЦК нашай партыі, Совнаркам — пінуць на гэту справу. Мы-ж дайшлі, — тут, я забяжаю ўперад, — да таго, што нядаўна наш Совецкі ўрад і наш ЦК вымушаны былі выдаць дэкрэт, закон, па якому за [illegible] працуючы мы, хто-б там ні было, настаўнікі, совецкія і гаспадарчыя работнікі, кожны з нас, калі гэта дазваляць, будзе прыцягвацца да крымінальнай адказнасці. Гэта, таварышы, як-бы гэта мяккай сказаць, ганьба для нашай работы такі дэкрэт, і тут трэба разумець ўсёю сабе тое, што ў нас адбываецца.

Мы ў Ленінградзе, напрыклад, кагляцем: кадры ў нас нядрэнныя, умелыя як быццам ёсць, заводы так самі па сабе [illegible], а вось калі што небудзь асабліва новае, асабліва по- вы заказ, то выходзіць, наступае: пачынаем паціхоньку рабіць, нарэшце, зробім: пачынаем абіраць, усё ні быта выходзіць; пераляцем на мес- ца — гэтага не хапае, тое не прыладжана, адно не палыходзіць, другое не салітна. І атрымліваецца палая цыганшчына.

Вось, напрыклад, турбабудаўніцтва, на ўвесь Саюз робім турбіны, займаем першае месца, а нашы турбіны да апошняга часу прычыняюць нам шмат клопатаў.

Толькі цяпер мы разблытваемся з тымі, якія мы рабілі ў папярэднія гады. І да гэтага часу яшчэ да канца не разблыталі. На пытанні якасці трэба наваліцца нам усім — і партыйцам, і гаспадарнікам — самым зверскім, самым бязлітасным чынам.

І заўважце, што ў нас выходзіць ёсць прадукцыя, якую мы вывозім за граніцу. Напрыклад, мы ў Ленінградзе робім машыны на экспарт, для заграніцы, і не такія простыя машыны, але я вам павінен сказаць, што калі трэба машыну для заграніцы — зробіць як след, а калі для сябе — то зусім не тое.

Вазьміце больш простую прадукцыю, скажам, харчовай прамысловасці. Таксама значную колькасць робім для заграніцы—аж да ўсякай канфеткі і інш. Дык калі вам паказаць заграничныя нашы канфеткі,—проста ад аднаго выгляду прыемна становіцца, не гаворачы ўжо аб тым, калі яе з'ясі. **(Смех).**

А вазьміце нашы. Вот нашы рабочыя на тых-жа заводах гавораць — сырэц, матэрыял іншы. Наконт матэрыялу таксама можна паспрачацца. Бо тут так: крыху саладзей, крыху менш — не выраўнае справы, а самы выгляд і якасць гэтай прадукцыі — за гэта трэба прыняцца пасапраўднаму.

Я ведаю на прыкладзе Ленінграда, як мы дабіваемся нашых поспехаў. Там, дзе мы наваліліся — там выходзіць. Два выпадкі прывяду ўсяго, не буду запягваць. У нас ёсць такі Іжарскі завод, вы ведаеце—аграмадны завод, мае аграмадныя гаспадарчыя задачы, адказныя рэчы робіць. Завод быў доўгі час у прарыве. Што мы зрабілі. Мы вы карысталі выпадак, тое, што пака- [illegible] месцы для рэарганізацыі работы і кіраўніцтва ў корані змянілі справу. Мы наваліліся на гэты завод за апошніх поўгода, як-бы не ўракнуць, завод змяніўся к лепшаму. Нічога не дадзелі: снабжэнне тое-ж самае, тыя-ж людзі ў асноўным, тое-ж абсталяванне, але толькі завод пастаўлен на чалавечую ногу, кожны адказвае за сваё месца, кожны адказвае за сваю справу і інш. Справа пашла. Тую-ж карціну мы бачым і на другім вялікім і важным ленінградскім заводзе «Красная заря», які амаль увесь 1933 год знаходзіўся ў вялікім прарыве, а цяпер толькі пасля перастаноўкі людзей і палянішання арганізацыі работ паспяхова выпраўляецца і бясспрэчна вы канае студзеньскую праграму бягучага 1934 года.

Такім чынам, як вы бачыце, ад арганізацыі справы залежыць поспех работы, і якасць, і ўсё іншае.

Цяпер некалькі слоў па пытанню адносна нашых далейшых затрат на закупку за граніцай ўсякага абсталявання для нашых фабрык і заводаў.

Калі вы прагледзіце ўсе нашы рэзалюцыі за апошні час на ўсіх канферэнцыях, то ў іх запісана, што наша цяжкая прамысловасць знаходзіцца зараз на такім высокім узроўні, што можа зрабіць любую машыну, любы варштат і агрэгат. Мы ўсе галасуем за гэта, гучна апладыруем гэтай справе. У нас у Ленінградзе мы прынялі такія ўстаноўкі і я ўпэўнен, што і ўсюды выходзяць з такіх-жа ўстановак **(Галасы: правільна).**

Вы гаворыце: «правільна». З другога боку, я не сумняваюся, што заўтра-ж, калі будзе дано якое-небудзь сур'ёзнае новае заданне таму, ці іншаму заводу, у тым ліку нашаму ленінградскаму, то першае, што пачуеш ад дырэктара завода, гэта: «заказ трэба прыняць, але для гэтага неабходна выпісаць такое-та і такое-та абсталяванне з-за граніцы».

Учора толькі галасавалі, што ўсё самі мы зробім, а сёння будуць трэбаваць — давай імпарт.

З гэтай справай трэба пакончыць. Мы маем у гэтых адносінах такую практыку і вопыт, што калі змагаемся за справу пасапраўднаму, пачэснаму — то выходзіць. Аказваецца — можна. Я не хачу ўсю віну ўзвальваць на адных толькі гаспадарнікаў — комуністаў. Тут вінаваты і нашы работнікі, якія вядуць непасрэдную партыйную работу на заводах, няма чаго граха таіць. Калі прымаюць заказ, то абстаўляюць выкананне яго такімі тэрмінамі, якія, як правіла, маюць нічым не апраўдаемыя рэзервы часу. Гэта робіцца для таго, каб можна было адрапартаваць аб выкананні заказа ў тэрмін і нават датэрмінова.

І вось, тут часта наглядаецца паміж нашымі гаспадарнікамі і партыйнымі пейкі «альянс». Калі пранануюць 100—давайце возьмем 50. Гэта больш надзейна, а потым паказываем: «перавыканалі». А раз так, то патрабнай мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў не атрымліваецца

ПРАЦЯГ НА 2 СТАР.

# Працяг прамовы тав. КІРАВА

З гэтым непартыйным падыходам да заказаў трэба канчаць.

Я-бы хацеў сказаць тут, што нашым партыйным работнікам трэба ў гэтых адносінах з пад уплыву гаспадарнікаў вызваліцца. А, з другога боку, трэба сказаць нашым гаспадарнікам, дырэктарам, што яны павінны падыходзіць к гэтаму, як і ва ўсёй сваёй рабоце, больш блізка, больш партыйнаму, памятаючы заўсёды аб тым, што яны не проста дырэктары, не проста тэхнічныя дырэктары, але перш за ўсё члены нашай комуністычнай партыі.

Вось, калі будзе, з аднаго боку, паболь чыста гаспадарчага погляду на ўсё ў нашых партыйных работнікаў і, з другога боку, больш партыйнага духу ва ўсёй штодзённай рабоце гаспадарнікаў, мы ў кароткі тэрмін здолеем знішчыць многія недахопы ў рабоце прамысловасці.

Далей, пара таксама самым рашучым чынам кінуць нашы старыя прыёмы і метады работы, якімі мы карысталіся да гэтага часу на нашых прамысловых прадпрыемствах, і, я-бы сказаў, крайне неабходна рэволюцыйным чынам укараніць новую культуру ў арганізацыю вытворчасці.

У гэтай справе адыгрывае агромадную ролю ўвядзенне тэхпромфін плана, даючага больш высокую асновy для работы нашых прамысловых прадпрыемстваў.

Я таварышы, запягнуў сваё выступленне. Каб вас не затрудняць больш, хацеў-бы толькі сказаць адносна тых агульных задач, якія стаяць перад намі зараз, якія падкрэсліў т. Сталін, і перш за ўсё, адносна чыгуначнага транспарта.

У сілу нашага асобнага геаграфічнага становішча, мы ленінградцы, затрудненні ў транспарце адчуваем багацей больш, чым хто-б там ні было. Мы павінны зараз больш, чым калі-небудзь, аддаць увагу праблеме транспарта, але выступаўшыя таварышы гаварылі больш аб чыгуначным транспарце і мала падкрэслівалі значэнне воднага транспарта. Мы тут нават прадстаўнікоў гэтага воднага транспарта не бачым, а ўсё-ж такі пара-бы ім пусціца ў сапраўднае плаванне па нашых агромадных рэках і морах (Смех і апладысменты). Такое плаванне будзе велізарным падспор'ем чыгуначнаму транспарту. Мы-ж маем такія водныя артэрыі, якіх не мае ні адна краіна. А што атрымліваецца? Мы нават зразумелай праграмы развіцця воднага транспарта не атрымалі. Мы пабудавалі Беламорска-Балтыцкі канал імя Сталіна, будуем агромадныя пабудовы, скажам, канал Масква-Волга, другія каналы намечаны. Гэта стварае новыя водныя шляхі. Калі сёння водныя не зразумеюць новых задач, якіх будуць прапаваць далей заўтра, яшчэ большыя патрабаванні паўстануць, паслязаўтра яшчэ большыя і так далей.

У нас часамі прынята гаварыць так, пытанні работы транспарта — гэта справа ўсёй партыі. Гэта правільна, хто-ж у гэтым сумняваецца? Гэта не толькі не аслабляе, але ўзмацняе, узнімае адказнасць за стан транспарта тых органаў кіраўнікоў, на якія ўскладзена прама і непасрэдна задача арганізаваць работу транспарта. Так трэба справу ставіць. Я ніколькі не змяншаю таго становішча, што пытанні транспарта—гэта пытанні ўсёй партыі. Гэта абсалютна правільна. Але, перш за ўсё, гэта пытанні тых арганізацый, якія закліканы гэту справу рабіць.

Тут шмат гаварылі на з'ездзе аб чыгуначным транспарце. Варашылаў выклаў справу вельмі добра, але транспартнікі звычайна гавораць вы нам мала дапамагаеце, транспарт — справа ўсёй партыі. Але-ж вы, вы, мілыя людзі, дзе вы? Перш за ўсё, вы павінны паболь-шэвіцку ўзяцца за справу, разбудзіць, разварушыць рабочых, падняць па ногі партыйную арганізацыю, таго-ж самага чыгуначнага, воднага транспарта. Там-жа рабочыя зусім не другарадныя. Гэта—глупства.

На транспарце такія-ж рабочыя, такія-ж члены партыі, як і ва ўсіх іншых галінах гаспадаркі. Трэба толькі здолець абапірацца на іх.

Таксама трэба падыйсці і да вырашэння жывёлагадоўчай праблемы. Уся партыя ставіць і шчыльна бя гандлю.

## Аб партыйнай вучобе і самакрытыцы

Апошняе пытанне, на якім хачу спыніцца і аб якім мы часта забываем у захапленні, відавочна, усімі астатнімі работамі. Я маю на ўвазе партыйна-масавую работу нашых арганізацый, пытанні прапаганды марксізма-ленінізма і палітычнага выхавання рабочых мас.

Трэба прама сказаць, што гэта адзін з вельмі адказных участкаў усёй нашай партыйнай работы. Цы намсі па практыцы выходзіць так—трэба прама пачэснаму прызнацца, што мы, занятыя заводамі, промфін планамі, праграмамі, калгасамі, соўгасамі, вуталем і так далей і інш., пакідаем часамі справу партыйнага выхавання ў баку. Няма таго, каб пазаняцца гэтымі пытаннямі шчыльна і глыбока. Складаюцца ўсякія метадычкі, праграмы, тэзісы, і для агітацыі, і для прапаганды, усё спускаецца ўніз. А я пачэснаму прызнаюся, што далёка не заўсёды цікавіўся да гэтых пор блізка, якія праграмы, якія метадычкі, чаму і як яны вучаць. Агітуюць, прапагандуюць, увогуле, зразумела, правільна агітуюць, але вось ці заўсёды разумее агітуемы тое, што яму гавораць, як даводзяцца да рабочага і калгасніка нашы лозунгі і рашэнні, аб гэтым мы, кіраўнікі, не заўсёды ведаем. А гэта далёка не апошняе пытанне.

Ад яго ў вялізарнай ступені залежаць нашы далейшыя поспехі.

Вядома, вельмі радасна бачыць п'есу якога-небудзь пісьменніка, які піша нашы совецкія п'есы, аб тым, як расце новае пакаленне, якое не бачыла ў жыцці, што такое жывы гарадавы і т. д. Гэта ўсё, вядома, вельмі добра. Але вот зараз расце яшчэ больш маладое пакаленне, якое не ведае, не мае ніякага жывога ўяўлення, апрача мазгавога аб тым, што такое беспрацоўе, беднасць, голад, па практыцы зусім не ведае гэтых рэчаў. Але-ж гэтых людзей трэба выхаваць, трэба даць ім зразумець ад чаго, чаму гэта адбылося. А гэта можа даць толькі добра пастаўленая прапаганда, агітацыя пакарысць нашай вялікай марксіска-ленінскай навукі. Ніякім другім спосабам гэтай справы не возьмеш. Я думаю, што ўсякую навуку, у тым ліку і тэхніку і механіку, мы павінны падымаць на такую вышыню, якая недаступна капіталістычным краінам. Гэта зусім верна. Скажам, навука аб супраціўленні матэрыялаў—гэта вельмі неабходная навука. Але мы ні на адну мінуту не павінны забываць, што жывем у такой абстаноўцы, калі тая навука, якая вывучае супраціўленне працістаячых нам класаў унутры краіны і за яе межамі—гэта навука павінна займаць першае месца. (Гром апладысментаў).

Узброеная ленінізмам, у непрымірымай барацьбе з апартуністамі усіх масцей, шырока паставіўшы большэвіцкае выхаванне ў сваіх радах, наша партыя як ніколі адзіна, маналітна, цвёрда і згуртавана вакол свайго ЦК, вакол тав. Сталіна. Таварышы, наша далейшая будоўля будзе таксама ў грамадзкай ступені моцна, калі мы будзем бяржліва і любоўна ажыццяўляць адзін з найвялікшых лозунгаў нашай партыі — лозунг самакрытыкі. Распаў сюдзвацца аб гэтым я-бы не хацеў, але мне прыходзіць у галаву гэта пытанне ў сувязі з учарайшым выступленнем тав. Варашылава. Я чуў ад асобных таварышоў, якія гаварылі, што Варашылаў як быццам занадта пераханіў у крытыцы недахопаў чыгуначнага транспарта. Гэта гаварылі асобныя таварышы, а з'езд, вы ведаеце, сустрэў выступленне тав. Варашылава зусім па другому (Шумныя апладысменты па адрасу тав. Варашылава).

Разважанне некаторых таварышоў аб тым, што ці незанадта многа самакрытыкі—вельмі шкодная штука. На самой справе, калі дрэнна, калі нікуды не варта, дык дзе-ж аб гэтым гаварыць, як не ў асяродзішчы нашай партыі. Калі я сёння як быццам нічога, смазлівенькі, а заўтра стаў неказістым, куды-ж мне ісці апрача партыі за лячэннем? (Апладысменты). Толькі такім парадкам можна мабілізаваць партыю. Тут часамі я, грэшны чалавек, думаю, не страшна нават, калі перагнеш, тут больш небяспечней, калі не дагнеш, таму што «Жэ неўская» самакрытыка, якой там займаюцца, — і так і гэтак, у якой не зразумеш, дрэнна ці добра, — нам не да твару, нам такой самакрытыкі не трэба.

У нас, большэвікоў, так вядзецца, калі самакрытыка — даводзіць да канца. І нічога тут не здарыцца, ніхто нікуды тут не праваліцца. Гэта толькі дапаможа выправіць справу і гэта захавае партыю ад небяспекі зазнайства, аб чым папярэджваў тав. Сталін.

Поспехі сапраўды ў нас аграмадныя. Чорт яго ведае, калі пачалаце чаму сказаць, так хочацца жыць і жыць (смех). На самой справе, паглядзіце, што робіцца. Гэта-ж факт. (Шумныя апладысменты).

Але ёсць небяспека, можна так захапіцца ўсякімі песнапеннямі, што перастанеш разумець, што кругом дзеецца. (Смех).

А без самакрытыкі папярэдзіць сябе ад галавакружэння ніякім чынам нельга. Самакрытыка — самая надзейная, адзіная моцная зброя, для папярэджання той хваробы, якую тав. Сталін назваў галавакружэннем ад поспехаў.

Я ведаю, што мне непрыемна было-б калі-б мне крыху крытыкнулі, можа быць, і я не так вясёла аб гэтым расказваў-бы (Смех), але гэта не значыць, што тое, што я кажу, няверна. Гэта абсалютна правільна. І ў гэтых адносінах даклад тав. Сталіна з'яўляецца зусім выключным. (Галасы з месц: правільна, апладысменты).

Паглядзіце, таварышы, там не было сказана — Іваноў, Пятроў, Сідараў, але ваяміце пытанне аб жывёлагадоўлі: хіба гэта не цяжкая рэч для ўсіх нас? А калі тав. Сталін сказаў аб гэтым, то некаторыя гаварылі, ці не лепш было-б не гаварыць аб гэтым.

Тым-часам большэвіцкая партыя можа і павінна ставіць хворыя пытанні толькі так, як гэта зрабіў тав. Сталін. А гэта значыць, што жывёлагадоўчая гаспадарка патрабуе велізарнай і неадкладнай работы партыі. І гэта было пастаўлена прама ў лоб для таго, каб гэту справу выправіць. І ад такой пастаноўкі мы толькі выйграем, бо яна мабілізуе партыю і рабочы клас, падымае іх актыўнасць.

Толькі партыя, якая ўсведамляе сваю сілу, толькі партыя, якая смела ідзе наперад, можа адкрыта перад усім светам так ускрыць недахопы сваёй работы. Няхай паспрабуюць паны капіталісты, якія ўстанавілі фашысцкі рэжым, нават для статыстыкі расказаць праўду аб тым, што ў іх робіцца з іх гаспадаркай, прадпрыемствамі, банкамі, валютай і т. д.

Я лічу, што ўзор самакрытыкі, калі браць яе пасапраўднаму, падзелавому, у дзеянні, а не тэарэтычна, дан нам у дакладзе тав. Сталіна. (Апладысменты).

Таварышы, калісці Троцкі (гаворачы гэта імя — і нядобры адразу настрой робіцца, будзь ён тройчы праклятым, каб яго памінаць на такіх з'ездах) абвінавачваў нашу партыю у «нацыянальнай абмежаванасці», у здрадзе інтэрнацыяналізму. Цяпер больш чым калі-небудзь відаць, чаго варта гэта контррэволюцыйная балбатня. Бо цяпер як ніколі стаіць высока наш аўтарытэт ва ўсім свеце сярод найшырэйшых мас рабочых і сярод сялян. А ворагі нашы навучыліся шанаваць нашу сілу і магутнасць. Тав. Літвінаў лепш за мяне расказаў-бы, чаму дасягнуты нашы поспехі ў міжнародным палітыцы, усе гэтыя пакты і інш. Калі-б мы пайшлі з гэтымі-ж пактамі пяць год таму назад з тым багажом, які мелі тады ў нашым социялістычным балансе, на міжнародную арэну, нас-бы ў сур'ёз не ўзялі, за дзівакоў палічылі-б. Зараз не тое. Мы гаворым не так голасна, можа быць, без лішніх фраз, але кожны разумее, што зараз за кожнай фразай скрываецца ў той ці іншай ступені тое, аб чым нам тав. Варашылаў так падрабязна ўчора расказваў. (Апладысменты).

Тут, таварышы, як ні прыкідвай, ці спадабаецца гэта каму-небудзь ці не спадабаецца, а магутнасць нашая, яна зараз відна для ўсіх і гэтым таварышы, мы заваёўваем новыя і новыя пазіцыі не толькі унутры нашай краіны, але і за межамі нашай вялікай социялістычнай бацькаўшчыны.

Тав. Сталін гаварыў, што мы закончылі фундамент социялістычнай будоўлі, што мы разгортваем работу для таго, каб узняць на гэтым вялікім фундаменце ўсе надбудовы, якія створаць новае, небывалае ў гісторыі чалавецтва грамадства, комуністычнае грамадства.

Работа, таварышы, не толькі захапляючая, але работа вельмі цяжкая, вельмі складаная і вельмі адказная. Але калі мы маем такі геройчы рабочы клас, які насяляе нашу совецкую краіну, калі мы маем такую партыю, якую выпеставаў наш вялікшы з людзей Уладзімір Ільіч Ленін, Совет, які засядае вось тут зараз, партыю, якая не ведае ніякіх перашкод, партыю, у якой у правадце сваёй справы няма ні малейшага сумнення, я думаю, што з такой партыяй, з такім рабочым класам зада чы, якія стаяць наперадзе, не толькі вырашальны, але могуць быць вырашаны бліскуча і пераможна, тым больш, што асноўныя труднасці ўжо засталіся ззаду.

Таварышы, дзесяць год таму назад мы пахавалі таго, хто стварыў нашу партыю, хто стварыў нашу пролетарскую дзяржаву. Але таксама дзесяць год таму назад вуснамі лепшага прадаўжальніка справы Леніна, лепшага кормчага нашай вялікай социялістычнай будоўлі, нашай мільённай партыі, нашага мільённага рабочага класа, вуснамі гэтага лепшага, мы далі святочную клятву выканаць вялікія запаветы Леніна. Мы, таварышы, з гордасцю, перад памяццю Леніна можам сказаць: мы гэту клятву выконаем, мы гэту клятву і надалей будзем выконваць, таму што клятву гэту даў вялікі стратэг вызвалення працоўных нашай краіны і ўсяго свята тав. Сталін. (Бурная авацыя ўсёй залы. Усе ўстаюць).

# XVII з'езд ВКП(б)

## РАНІШНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 2 ЛЮТАГА

З'езд пераходзіць к наступнаму пытанню парадку дня—справаздачнаму дакладу дэлегацыі ВКП(б) у Выканкоме Комуністычнага Інтэрнацыянала.

Адкрывае пасяджэнне тав. К. Нікалаева. Яна прадастаўляе слова для даклада тав. Мануільскаму. Дэлегаты, стоячы, горача вітаюць тав Мануільскага.

## Тав. Мануільскі

Прагноз тав. Сталіна, зроблены ім на 16 з'ездзе,—гаворыць тав. Мануільскі,—дэталёва аналізуючы сучасное становішча сусветнага капіталізма, за мінулыя гады пацверджан усім ходам сусветнага развіцця. Свет падыходзіць да другога туру рэволюцый і войн. Пяць год эканамічнага крызіса расхісталі сусветную сістэму капіталізма, паглыбілі яго агульны крызіс, стварылі ўмовы для перарастання агульнага крызіса ў крызіс рэволюцыйны. За гэтыя пяць год вырасла палітычная і эканамічная магутнасць Совецкага Саюза. Мацнеюць советы ў Кітаі.

У краінах капітала расце страшэнная, беспрасветная галеча. Паводле даных эканаміста Кучынскага, сярэдняя зарплата германскага рабочага ў адносінах да 1928 г. упала у 1933 годзе да 66 проц. і пакрывае пражытачны мінімум толькі напалову. А за час фашысцкай дыктатуры германская буржуазія, скарачаючы социяльнае страхаванне, аграбіла рабочых на 3,5 млрд. рублёў. У рэзультаце крызіса і рацыяналізацыі мільёны рабочых астаюцца за бартом. Права на работу становіцца прывілеяй, якую фашысты скарыстоўваюць для раскола рабочага класа.

Характарызуючы абвастрэнне імперыялістычных супярэчнасцяй, тав. Мануільскі адзначае, што гэтыя супярэчнасці паспелі настолькі, што пытанне аб перадзеле свету паўстае з яшчэ з большай астратой, чым у 1914 годзе. Новая імперыялістычная вайна стаіць у парадку дня. Спешна вядзецца падрыхтоўка вайны супроць СССР. Толькі страх буржуазіі перад пролетарскай рэволюцыяй сковывае яе імкненні ў адносінах скарачэння тэрмінаў гэтай падрыхтоўкі.

Элементы рэволюцыйнага крызіса нарастаюць усюды, хоць і няроўнамерна. Сілы пролетарскай рэволюцыі растуць, хоць у пераважнай большасці краін яны яшчэ не паспелі для неадкладнага рэволюцыйнага звяржэння капіталізма. Душныя мінуты перад навальніцай прарэзваюць вогненыя зарніцы, прадвеснікі надыходзячых рэволюцый. Масавыя рабочыя стачкі, сялянскія паўстанні, ваенныя бунты, ліхаманочная падрыхтоўка сусветнай буржуазіяй новай імперыялістычнай вайны, пераход яе да фашызма, г. зн. да непасрэднай адкрытай тэрарыстычнай дыктатуры, сведчыць аб слабасці буржуазіі, нездольнай ужо кіраваць нармальнымі «дэмакратычнымі» метадамі.

Тав. Мануільскі асабліва падрабязна спыняецца на рэакцыйнай ролі германскіх фашыстаў і японскіх мілітарыстаў, якія мараць аб крыжовым паходзе супроць сусветнага большэвізма. Ваенны напад на СССР — падкрэслівае тав. Мануільскі—развяжа сілы сусветнай пролетарскай рэволюцыі і паскорыць немінучы канец капіталістычнай сістэмы.

Тав. Мануільскі напамінае, што і рускі царызм думаў, што яму шляхам крывавых рэпрэсій ўдалося распраўіцца з рабочым класам, з яго большэвіцкай партыяй.

Аднак,—пад гром апладысментаў гаворыць тав. Мануільскі,—пролетарская рэволюцыя самую адсталую краіну ў свеце ператварыла з жандарма капіталістычнага парадку ў вялікага часавога социялістычнага парадку.

Тав. Мануільскі раскрывае практыку нечуванага здрадніцтва германскай социял-дэмакратыі і ўсяго II Інтэрнацыянала, усёй сваёй палітыкай падрыхтаваўшых крывавую фашысцкую дыктатуру.

II Інтэрнацыянал, падводзіць вынікі тав. Мануільскі,—галоўная апора сусветнай рэакцыі. Ён адыгрывае зараз у справе абману буржуазіяй народных мас тую-ж ролю, якую раней адыгрывала царква.

Пад бурны смех усёй залы тав. Мануільскі цытуе апошнія «адкравенні» сацыял-дэмакратычных тэарэтыкаў, якія сведчаць аб найвялікшым ідэйным разбродзе, аб гістарычным ваганні ў II Інтэрнацыянале, аб новых «фармулёўках», маскіруючых прамое здрадніцтва інтарэсаў пролетарыята, накшталт: «Мы за социялізм, але без пролетарскай рэволюцыі», або «мы за пролетарскую рэволюцыю, але без пролетарскай дыктатуры».

Пераходзячы да ацэнкі работы Комінтэрна за мінуўшы перыяд, тав. Мануільскі з асаблівай сілай падкрэслівае, што тыя поспехі, якія ёсць у радзе секцый, тлумачацца тым, што Комінтэрн ідзе па таму шляху, якім яго вёў Ленін, а зараз вядзе наш мудры настаўнік, правадыр рабочага класа ўсяго света тав. Сталін. (Бурныя апладысменты).

Тав. Сталін дапамагаў нам ускрываць памылкі ў рабоце компартый.

Тав. Сталін не раз нам указваў, што асноўнае ў рабоце Комінтэрна —гэта заваяванне мас.

Цвёрда праводзячы ў жыццё гэта ўказанне тав. Сталіна, мы маем значныя поспехі амаль па ўсіх брацкіх компартыях.

Перш за ўсё за гэтыя гады значна ўзраслі самі компартыі.

Найбольшых дасягненняў у гэтых адносінах дасягнула кітайская комуністычная партыя. За адзін толькі 1933 год яна павялічыла свае рады на 120 тыс. чал.

Кітайская комуністычная партыя, несумненна, з'яўляецца адным з лепшых баявых атрадаў Комуністычнага Інтэрнацыянала. Яна здолела развіць велізарную работу па заваяванню мае як у совецкіх раёнах Кітая, так і ў тых правінцыях, дзе яна працуе нелегальна. Кітайская компартыя здолела стварыць такі ўзброены атрад, як кітайскую Чырвоную армію, аб які, як аб непахісную скалу, разбіваюцца ўсе спробы Чан Кай-шы задушыць і патапіць у крыві мільёны рабочых і сялян Совецкага Кітая. Усе 6 паходаў Чан Кай-шы супроць Совецкага Кітая скончыліся поўным яго паражэннем і тэхнічным пераўзбраеннем Чырвонай арміі за кошт праціўніка. (Бурныя апладысменты).

Вельмі папырыўся ў Кітаі партыйны занскі рух. Кітайскія чырвоныя партызаны адыгралі велізарную ролю ў адбіцці ўсіх атак Чан Кай-шы.

Тав. Мануільскі прыводзіць цікавую вытрымку з аднаго англійскага журнала: «Немагчыма адрозніць сумленных земляробаў ад комуністаў...» (Смех). (Апладысменты).

Другім балявым атрадам Комінтэрна—гаворыць тав. Мануільскі—які мае велізарныя дасягненні за мінуўшы перыяд, з'яўляецца германская комуністычная партыя. Германская комуністычная партыя, не гледзячы на тое, што яна загнана ў падполле, не гледзячы на жудасны фашысцкі тэрор, працуе самааддана, як на фронце, пабольшэвіцку.

Германская комуністычная партыя налічвае каля 100 тыс. членаў з ліку лепшых германскіх пролетарыяў, якія адчулі ўвесь цяжар фашысцкага рэжыму. (Бурныя апладысменты).

«Увайшоўшыя за апошні год у германскую компартыю — гаворыць тав. Мануільскі—гэта сапраўдныя героі, гэта каштоўнейшае, што ёсць у германскім рабочым класе. Гэта сапраўды пролетарскае золата» (Бурныя апладысменты). Гераічная германская компартыя, якая працуе ва ўмовах найцяжэйшага падполля, калі лепшыя яе прадстаўнікі на чале з тав. Тэльманам, (Бурныя, доўгія апладысменты, усе ўстаюць) пакутуюць у фашысцкіх засценках — у гэтых умовах выкоўвае новыя кадры, моцна загартаваныя ў барацьбе з фашызмам.

Арганізаваны фашыстамі працэс аб падпале рэйхстага, меўшы на мэце кампраметаваць германскую компартыю, а разам з ёй і Комуністычны Інтэрнацыянал, ганебна праваліўся і падняў на яшчэ большую вышыню аўтарытэт германскай компартыі і Комуністычнага Інтэрнацыянала ў рабочых масах і ў масах прыгнечаных народаў калоній усяго свету.

Увесь свет захапляўся гераічнымі паводзінамі на лейпцыгскім працэсе Георгія Дзімітрава. (Усе дэлегаты ўстаюць і нападжваюць авацыю), які перад тварам рабочага класа ўсяго света выкрыў брудны крывавы твар германскага фашызма. Увесь пролетарскі свет захапляўся гераічнымі, сапраўды большэвіцкімі паводзінамі Георгія Дзімітрава. Голас яго—голас мільёнаў.

Доўга незмаўкаемымі гарачымі апладысментамі таксама сустракаюцца словы тав. Мануільскага аб тым, што не гледзячы на жудасны фашысцкі тэрор, гераічная комуністычная партыя Германіі паспяхова праводзіць сваю работу. Калі ў 1914 годзе ў Германіі гучэў голас адзіночкі—голас Лібкнехта, дык зараз гучыць магутны голас тысячы Лібкнехтаў. (Бурныя апладысменты).

Мы маем за гэтыя гады рост комуністычных радоў і па іншых секцыях Комуністычнага Інтэрнацыянала: ва Францыі, Польшчы, Чэхаславакіі і т. д. Паспяховая работа компартыі ў Англіі характарызуецца тым, што нават студэнты старадаўнейшых арыстакратычных універсітэтаў Оксфордскага і Кембрыджскага пачалі гаварыць нашаю мовай: «Калі пачнецца вайна, мы не будзем абараняць, ні караля, ні бацькаўшчыны. Дурныя няма». (Смех).

Тав. Мануільскі далей робіць падрабязную характарыстыку гераічнай работы компартыі Японіі, якая вядзе мужную барацьбу супроць інтэрвенцыі ў Кітаі. Японская партыя служыць узорам правільнай арганізацыі і шырокага размаху масавай большэвіцкай работы для ўсіх іншых партый Комінтэрна.

Компартыі III Інтэрнацыянала ў сваіх вялікіх настаўнікаў Леніна і Сталіна навучыліся непрымірымасці да ўхілаў. У барацьбе на два фронты Комуністычны Інтэрнацыянал дабіўся такой згуртаванасці сваіх радоў, якую цяпер не пахісне ніякая сіла. (Доўгія апладысменты).

Комуністы ўсіх краін вучацца ў Сталіна змагацца і перамагаць, пільна глядзець уперад, накапліваць сілы і нанасіць класаваму ворагу сакрушальныя ўдары. Комуністы брацкіх компартый ведаюць, што справа Леніна, справа сусветнай пролетарскай рэволюцыі знаходзіцца ў верных руках. (З'езд устае і нападжвае тав. Сталіну гарачую авацыю).

Пад сцягам Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна мы пераможам па ўсім свеце. (Крыкі «ура», усе дэлегаты ўстаюць).

Заціхшая на мінуту авацыя з новай сілай аднаўляецца, калі старшынствуючая тав. Нікалаева адкрывае спрэчкі па дакладу і прадастаўляе слова тав. Ван-Мін. (Кітайская компартыя).

Раздаюцца гулкія крыкі «Няхай жыве кітайская компартыя», «ура».

Тав. Ван-Мін перадае ад ЦК кітайскай компартыі палкае большэвіцкае прывітанне правадыру Комінтэрна тав. Сталіну і дэлегатам XVII з'езда, а ў іх асобе ўсім працоўным Совецкага Саюза.

Ён дае падрабязную характарыстыку становішча ў совецкіх раёнах Кітая і гераічнай барацьбы кітайскай Чырвонай арміі.

З'езд часта прарывае прамову тав. Ван-Міна бурнымі апладысментамі.

Канец выступлення тав. Ван-Міна перанесен на вячэрняе пасяджэнне з'езда.

## ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭННЕ 1-га ЛЮТАГА

Першай у спрэчках па справаздачнаму дакладу т. Рудзутака аб рабоце ЦКК-РСІ выступае т. М. І. Ульянава, спатканая доўгімі апладысментамі.

## Тав. Ульянава

XVII з'езд партыі, — гаворыць тав Ульянава, — увойдзе ў гісторыю не толькі як з'езд, які падвёў вынікі першай соцыялістычнай пяцігодкі, не толькі як з'езд, які прыняў грандыёзны план другой пяцігодкі, але і як з'езд, якому не прышлося займацца аназіцыямі і ўхілам. Аназіцыя і ўхілы разгромлены партыяй, узначальваемай Сталіным — арганізатарам нашых перамог, лепшым саратнікам Ільіча, вялікім прадаўжальнікам яго справы.

Пад кіраўніцтвам Сталіна выраплана задача соцыялістычнай перабудовы дробна-сялянскай гаспадаркі; канчаткова і беспаваротна вырашана на карысць соцыялізма пытанне «хто каго». Соцыялістычная рэволюцыя падняла на барацьбу і будаўніцтва гіганцкія народныя тоўшчы вылучыла мільёны ўдарнікаў соцыялістычных заводаў і палёў. Нашы поспехі вымушаны нават прызнаць нашы ворагі.

Але нам большэвікам, не ўласціва зазнавацца. Большэвікі адкрыта гавораць аб недахопах і непаладках, мабілізуючы масы на барацьбу з імі, знішчаючы самыя прычыны, што нараджаюць гэтыя недахопы. Але нязмерна выраслі ў нас магчымасці барацьбы з імі.

Для таго, каб правесці ў жыццё лозунг т. Сталіна — пановаму працаваць, пановаму кіраваць, — мы павінны палепшыць кантроль, палепшыць праверку выканання ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва, пакончыць з канцылярска-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва.

ЦКК-РСІ адыграла вялікую ролю ў барацьбе з бюракратызмам. Аднак, не ўсюды органы КК-РСІ былі на вышыні становішча. Яны нярэдка залежалі ад мясцовых уплываў. Асабліва культала ў гэтых адносінах работа раённых кантрольных камісій.

На радзе прыкладаў т. Ульянава паказвае далей наспеўшую неабходнасць замены кантрольных камісій, бяссільных вельмі часта ўздзейнічаць нават на сельсавет, упоўнаважанымі, назначанымі з цэнтра і толькі цэнтра падначаленымі. Яна цытуе пісьмо Уладзіміра Ільіча, у якім гаворыцца аб неабходнасці мець у кожнай губерні аднаго-двух асабліва даверaных і надзейных таварышоў, якія непасрэдна зносяцца з цэнтральнымі органамі і памагаюць ім ажыццяўляць на мясцах кантроль і праверку выканання.

Тав Ульянава расказвае з'езду аб вялікай рабоце, праробленай аб'яднаным бюро скаргаў пры ЦКК-РСІ. Яно ператварылася ў баявы орган, цяснейшым чынам звязаны з масамі згуртаваўшы вакол сябе агромадны актыў рабочых і калгаснікаў, праробіўшы немалую работу па ўстараненню ўсякага роду непарадкаў.

Падкрэсліваючы неабходнасць усямернага ўзмацнення барацьбы з бюракратызмам, цеганінай у нашым апараце, т. М. І. Ульянава прыводзіць словы т Сталіна аб тым, што чуласць да запатрабаванняў мас — асноўная запаведзь партыі. Асабліва адказныя задачы стаяць у барацьбе з бюракратызмам перад нашымі масавымі арганізацыямі, у першую чаргу перад профсаюзамі «На вялікі жаль, — гаворыць Марыя Ільінішна, — профсаюзы не заўсёды стаяць на вышыні сваіх задач»

13 год таму назад, — успамінае Марыя Ільінішна, — Ленін гаварыў з поваду закрыцця Сухарэўскага рынка, аб той усерасійскай «Сухарэўцы», якая жывіць псіхалогію мільёнаў дробных гаспадарыкаў. У сучасны момант «Сухарэўка» ліквідавана не толькі ў Маскве, але і па ўсім СССР, паколькі вырваны карэнні капіталізма, паколькі пабудован фундамент соцыялістычнага грамадства. Зараз мы павінны ставіць пытанне аб ліквідацыі астаткаў «Сухарэўкі» ў свядомасці людзей. Для гэтага неабходна перш за ўсё асаблівую ўвагу аддаць запатрабаванням канкрэтных, жывых людзей. Канчаткова перарабіць свядомасць гэтых жывых людзей можна толькі праз масавыя арганізацыі, шляхам масавай палітычнай выхаваўчай работы. Іншым шляхам да іх не дойдзеш.

Зусім правільна ўказаў тав. Сталін у сваім дакладзе, — заканчвае т. М. І. Ульянава, — што перамога не прыходзіць сама.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале са Сталіным, мы пойдзем да новых перамог, з цвёрдай упэўненасцю ў магутнай, непераможнай сіле партыі, якая на сваім XVII з'ездзе прадэманстравала ўсяму свету небывалую згуртаванасць сваіх радоў. (Бурныя апладысменты).

## Тав. Яраслаўскі

Доўгімі апладысментамі сустракае з'езд выступленне тав Яраслаўскага.

— На гэтым з'ездзе, — сказаў ён, — з'ездзе пабудовы бясклассавага соцыялістычнага грамадства, кожны з нас асабліва моцна адчувае наближэнне канчатковай перамогі комунізма. Азіраючыся на пройдзены пятгодзьдзі 30-гадовы шлях, кожны з нас адчувае глыбокую радасць атрыманых перамог, кожны ўсведамляе, што гэтымі перамогамі за апошнія 10 год мы абавязаны таму, што наўхільна ішлі па шляху, указанаму Леніным, пад кіраўніцтвам геніяльнага правадыра партыі т. Сталіна. (Апладысменты). Перамогі дасягнуты таму, што партыя захавала адзінства сваіх радоў, разграміла ўсіх апартуністаў, вяла і вядзе з імі непрымірымую барацьбу.

XVII з'езд дае нам праграму грандыёзных работ, узнімаючую нашу краіну на новую вышыню, аб якой нам нядаўна і марыць было цяжка. Гэта праграма выцякае з ленінскага плана пабудовы соцыялістычнага грамадства. Яе паслядоўна і мудра ажыццяўляе т. Сталін.

Тав. Яраслаўскі расказвае аб тым, як Цэнтральная Кантрольная Камісія змагалася за адзінства партыі, за чыстату яе радоў. З часу XVII з'езда ЦКК прыцягнула да партыйнай адказнасці 611 членаў і кандыдатаў партыі за прыналежнасць к трацкізму і іншым контррэволюцыйным групам. З гэтага ліку выгнаны з партыі 146 трацкістаў, 197 правых апартуністаў, за прыналежнасць да нацыянальных контррэволюцыйных груповак — 16. Гэта барацьба вялася і мясцовымі кантрольнымі камісіямі.

— Было-б памылкай думаць, — гаворыць тав. Яраслаўскі, — што зараз ужо няма ў партыі трацкістаў, правых апартуністаў і іншых антыпартыйных элементаў.

Няма патрэбы спыняцца на тым, што прадстаўляе сабой міжнародны трацкізм. Троцкі стаў арганізатарам усіх рэнегацкіх груп і адкідаў рабочага руху. Адносна многіх з гэтых груп трэба сказаць беспамылкова, што яны знаходзяцца на ўтрыманні буржуазіі. Напрыклад, шведская група была на ўтрыманні ў вядомага каралём запалак Крэйгера.

Мы, — гаворыць далей т. Яраслаўскі, — павінны памятаць, што агенты трацкізма ёсць яшчэ ў нашай партыі, што з двурушнікамі, трацкістамі, правымі, якія прабуюць у радах нашай партыі прадаўжаць разлагаючую работу, мы вялі і будзем весці ў далейшым бязлітасную барацьбу. Зусім правільна ўказаў тав. Сталін, што ў сваёй практычнай праграме правыя і «левыя» самкнуліся настолькі тых іх цяжка адрозніць. Практыка ЦКК паказала, што другія контррэволюцыйныя арганізацыі ахвотна далучаюцца да праграмы гэтых груп.

Падкрэсліўшы неабходнасць барацьбы з рэлігійнай ідэалогіяй, пад прыкрыццём якой працуюць контррэволюцыйныя элементы, т. Яраслаўскі далей пераходзіць да пытанняў арганізацыі партыйнага і совецкага кантроля. У нас змянілася абстаноўка барацьбы, вырасла маналітнасць партыі, і новыя задачы дыктуюць не аслабленне, а ўмацаванне партыйнага кантроля. Ёсць людзі, якія былі-б рады ліквідацыі органаў дзяржаўнага кантроля. Дарэмна яны думаюць, што рэарганізацыя кантрольных камісій аслабіць руку партыі ў адносінах тых, хто парушае рашэнні партыі і ўрада. Партыя і дзяржава двума рукамі ахопяць парушальнікаў гэтых рашэнняў.

Гаворачы аб рабоце мясцовых кантрольных камісій, т. Яраслаўскі ўказвае, што некаторыя КК не справіліся з ускладзенымі на іх задачамі. Гэта асабліва ярка сказалася на Ўсходня-Сібірскім краі. Тут кантрольная камісія не толькі не змагалася з агіднасцямі, раскраданнем і разбазаваннем дзяржаўных сродкаў у залатой прамысловасці, Сібпушніне, Ахотсаюзе і іншых арганізацыях, але ў рэзультаце сямейнасці і кругавой парукі ў радзе выпадкаў прыцягвала да адказнасці тых, хто змагаўся супроць гэтых агіднасцяй.

Тав. Яраслаўскі спыняецца на выніках чысткі партыйных арганізацый дзесяці краёў і абласцей. З агульнага ліку ўсіх праверaных членаў і кандыдатаў партыі было выключана 17 проц., пераведзена ў кандыдаты 9,8 проц. і ў спачуванчыя 6,3 проц.

Станоўчыя рэзультаты чысткі не толькі ў тым, што яна адсекла ўсё нягоднае ў нашай партыі. Чыстка ад начасова павысіла ўдзельную вагу рабочага ядра ў складзе партыйных радоў. Па дзесяці абласцях і краях, закончыўшых чыстку, удзельная вага рабочага ядра паднялася з 67

# XVII з'езд ВКП(б)

## ВЕЧЭРНІК ВЯЧЭРНЯГА ПАСЯДЖЭННЯ 2 ЛЮТАГА 1934 Г.

...чэрняе пасяджэнне з'езда адкрывае тав. ПОСТЫШАЎ. Тав. Ванзаканчвае сваю прамову.

...яхай жыве тав. Сталін», — гаворыць ён у заключэнне на сваёй ...ай мове. Гэтыя словы пакрываюцца бурай апладысментаў. Далеяк адзін устаюць і наладжваюць шумную авацыю.

...тым выступае спатканы доўгімі апладысментамі прадстаўнік японскай компартыі тав. ОКАНО.

...в. Окано ад імя Цэнтральнага комітэта японскай камуністычнай партыі перадае XVII з'езду перамож...і і правадыру сусветнага пролетарыята гарачае прывітанне. Прывітанне сустракаецца бурай апладысментамі.

...в. ГЕККЕРТ гаворыць па нямецкай мове. Ён перадае з'езду і віду... партыі Камінтэрна палкае брацкае прывітанне ад германскіх камуністаў. Тав. Геккерт падкрэслівае, што ён глыбока перажыў на з'ездзе...нт, калі бачыў жывое ўвасабленне большэвіцкага адзінства (б) — энтузіязм і захапленне делегатаў пры выступленні Сталіна і ў момант прыняцця рэзалюцыі па яго дакладу.

...арактарызаваўшы становішча ў Германіі і работу компартыі, тав. Геккерт пад бурныя апладысменты ...а заканчвае сваю прамову:

Пад сцягам Маркса-Энгельса-Сталіна праходзіць Ваш шлях. Пад гэтым сцягам пойдзе ў бой наша партыя.

...в. ДОЛАРЭС гаворыць іспанскай мове. Яна перадае палкае прывітанне з'езду ад ЦК компартыі Гішпаніі і рэволюцыйных рабочых і сялян, натхняемых у сваёй барацьбе прыкладам Окцябра.

...сказаўшы з'езду аб рэволюцыйнай барацьбе гішпанскага пролетарыята і сялянства і поспехах гішпанскай компартыі, т. Доларэс заяўляе:

Рабочыя і сяляне Гішпаніі паклёнуць разумець, што толькі соцыяльная ўлада выратуе іх ад капіталістычнай і паменчыцкай эксплуатацыі. Гішпанская компартыя заклікае палітычна і арганізацыйна рыхтаваць масы да рэволюцыі.

...а заканчвае сваю прамову выгукам, які пакрывае ўсіх бурнай авацыяй усіх делегатаў:

Няхай жыве правадыр пролетарыяту і працоўных усяго свету т. Сталін!

...в. БЕЛЕЎСКІ, сустрэнуты бурнымі авацыямі, ад імя Цэнтральнага комітэта комуністычнай партыі Польшчы перадае XVII з'езду ВКП(б) ...ае прывітанне.

Калі, — гаворыць т. Белеўскі, — ...XVI з'ездзе ВКП(б) т. Ленскі паказаў, што компартыя Польшчы ...ніла на шлях капсалідацыі, то ...гу далажыць XVII з'езду, што ...працэс капсалідацыі поўнасцю ...ачан.

...в. Белеўскі расказвае аб поспехах польскай компартыі і бярэ пад ...шэвіцкую самакрытыку яе недахопаў. Бура апладысментаў пакрывае апошнія словы:

Няхай жыве большэвіцкая партыя!

Няхай жыве яе правадыр і ...адыр сусветнага пролетарыята ...Сталін!

...езд устае і наладжвае доўгую ...ую авацыю.

...в. РЭСТ (Англія), з'яўленне якога трыбуне выклікае гром апладысментаў, гаворыць пераважна аб ...ьбе англійскай компартыі супраць падрыхтоўкі антысавецкай вайны ...аб узрастаючых сімпатыях англійскіх рабочых мас да СССР — ...каўпчыны ўсяго сусветнага ...етарыята, аб поспехах англійскіх ...комуністаў у арганізацыі адзінага рабочага фронту.

...утнай, доўгай авацыяй адказ...з'езд на заключныя словы т. Рэс.

Няхай жыве СССР!

Няхай жыве сусветная пролетарская рэволюцыя!

...в. БЕЛА-КУН, якому з'езд наносіць бурную авацыю, падрабязнае...ецца на барацьбе брацкіх партый супроць антысавецкіх ...гур імперыялістаў, супроць падрыхтоўкі новай імперыялістычнай ...ны, на іх рабоце, накіраванай к ...ізацыі мас у абарону СССР.

Не было ніводнай антысавецкай правакацыі, — гаворыць т. Бела-Кун, — якую міжнародны пролетарыят ...е сустрэўбы ў штыхі. Пасля ...ваканцыйнага стрэла Гаўрылава ...цкая компартыя развіла магутную агітацыйную кампанію на ...ыццю белагвардзейскіх і інтэрвенцыянісцкіх элементаў. З значным поспехам правяла компартыя ...ю кампанію супроць налажання ...ворнага на прывоз совецкіх тавараў. Комуністам удалося прыцягнуць да сваёй антываеннай работы ...олькі найшырэйшыя рабочыя ...ы, але і перадавую інтэлігенцыю.

У парадку самакрытыкі, — заканчвае т. Бела-Кун, — трэба сказаць, што барацьба супроць падрыхтоўкі імперыялістычнай вайны мае поспехі толькі ў тых краінах, дзе комуністы як след узяліся за антываеннаю работу. Там, дзе сапраўдная работа ў гэтым напрамку не вядзецца, як напрыклад у Скандынаўскіх краінах, мы маем і нязначныя поспехі.

Тав. Бела-Кун падкрэслівае, што палітычныя поспехі компартыі ў барацьбе супроць падрыхтоўкі новай імперыялістычнай вайны ляічэ недастаткова замацаваны арганізацыйна.

Тав. Бела-Кун гаворыць аб барацьбе, якую ваеннае пытанне выклікала ў радах соцыял-дэмакратычных партый. У той час, як соцыял-дэмакратычнае кіраўніцтва стаіць нарэшце на пункце погляду абароны буржуазнай «бацькаўшчыны», соцыял-дэмакратычныя рабочыя чула прыслухоўваюцца да комуністычнай антываеннай прапаганды. Асабліва гарачае спачуванне сустракае дзейнасць компартыі, накіраваная супроць імперыялісцкіх ваенных авантур, сярод соцыялістычнай рабочай моладзі. Бельгійская соцыялістычная «маладая гвардыя», не гледзячы на забарону Вандэрвельдэ, выказалася за адзіны фронт з комуністычнымі рабочымі супроць імперыялістычнай вайны.

Усе міжнародная абстаноўка, становішча міжнароднага рабочага руху гаворыць за тое, што ў выпадку ўзнікнення імперыялістычнай вайны працэс ператварэння яе ў грамадзянскую ў радзе краін пройдзе значна хутчэй, чым гэта было ў 1914 годзе.

Компартыі змагаюцца супроць вайны, ажыццяўляючы лозунгі ленінскі, сталінскі: На абарону СССР, на абарону Совецкага Саюза.

Даклад тав. Сталіна на гэтым з'ездзе — канчае тав. Бела-кун — узброіць комуністычныя партыі ўсіх краін, рабочы клас усяго свету на новыя, рашаючыя баі за перамогу комунізма на ўсім свеце. (Бурныя, доўгія апладысменты).

Наступным выступае, сустрэнуты апладысментамі тав. КНОРЫН. Тав. Кнорын з пачатку свайго выступлення падкрэслівае, што выступленні прадстаўнікоў брацкіх компартыі па дакладу тав. Мануільскага паказваюць адзінства, маналітнасць, згуртаванасць Комуністычнага Інтэрнацыянала вакол правадыра сусветнага пролетарыята тав. Сталіна. Гэтыя словы тав. Кнорына з'езд сустракае бурнымі апладысментамі.

У далейшым сваім выступленні тав. Кнорын, развіваючы палажэнне тав. Сталіна аб тым, што «рэволюцыя ніколі не прыходзіць сама, яе трэба заваяваць», спыняецца на тых задачах, якія адсюль вынікаюць для комуністычных партый усіх краін.

Асноўнай задачай для ўсіх компартый — гаворыць тав. Кнорын — з'яўляецца далейшая большэвізацыя партый і заваяванне мас.

Асаблівую ўвагу трэба сканцэнтраваць на вызваленні рабочага класа ад астаткаў уплыву ўжо даволі збан крутаваўшай социял-дэмакратыі. Мы павінны выкрываць перад шырокімі масамі здрадніцтва, ману дэмагагічных лозунгаў і прыёмаў, з якімі выступае перад рабочымі социял-дэмакратыя. Неабходна ўзмацніць у значнай ступені шырокую прапаганду поспехаў нашага Совецкага Саюза. Ідучы па шляху большэвізацыі компартый, прыцягнення найшырэйшых рабочых і сялянскіх мас, — заканчвае тав. Кнорын, — мы забяспечым перамогу ідэй Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна ва ўсім свеце. (Доўгія апладысменты).

Услед за тав. Кнорыным выступае сустрэты апладысментамі тав. ЛАЗОЎСКІ.

Вынікі, з якімі падышла — гаворыць тав. Лазоўскі — сусветная буржуазія да новага 1934 года, можна ахарактарызаваць біблейскім тэкстам — «на рэках вавілонскіх тамо седохом і плакахом».

Увесь свет прыслухоўваецца да таго, што гаворыць Масква.

Даклад тав. Сталіна на даным з'ездзе — гэта праграма не толькі для нашага рабочага класа, але і для ўсяго міжнароднага пролетарыята.

Даклад тав. Сталіна не толькі намячае асноўныя задачы, але і ўказвае, як гэтыя задачы павінны быць вырашаны тактычна і арганізацыйна.

У далейшым сваім выступленні тав. Лазоўскі спыняецца на задачах, якія стаяць перад сусветным рэволюцыйным прафсаюзным рухам. Асаблівую ўвагу, — гаворыць тав. Лазоўскі, — мы павінны звярнуць на заваяванне мас і арганізацыю іх у чырвоныя профсаюзы. Слабай старой нашай работы з'яўляецца работа ў рэакцыйных профсаюзах і іх выкрыцці перад шырокімі масамі рабочага класа.

Не можа быць ніякага сумнення ў тым, — заканчвае тав. Лазоўскі, — што, ідучы тым шляхам, які нам указаў тут тав. Сталін, мы прыйдзем да канчатковай перамогі ва ўсім свеце. (Доўгія апладысменты).

Выступленнем тав. Лазоўскага закончваюцца спрэчкі па дакладу тав. Мануільскага.

Ад імя Маскоўскай, Ленінградскай і Украінскай делегацый тав. Н. Н. ПАПОЎ прапануе рэзалюцыю па справаздачы делегацыі ВКП(б) у Камінтэрне, цалкам ухваляючую палітычную лінію і практычную работу делегацыі.

Рэзалюцыя пад бурныя апладысменты ўсёй залы прымаецца адпагалосна.

На гэтым вячэрняе пасяджэнне з'езда абвяшчаецца закрытым.

# ТЭХНІКА Ў ПЕРЫЯД РЭКАНСТРУКЦЫІ ВЫРАШАЕ ЎСЁ

*(Да гадавіны прамовы т. Сталіна „аб задачах гаспадарнікаў" — 7 лютага 1931 г.)*

Пытанні тэхнікі ў работах Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна займаюць адно з важнейшых месц. Класікі тэорыі марксізма ацэньваюць тэхніку, як магутны фактар усяго грамадскага развіцця. «Тэхналогія раскрывае актыўныя адносіны чалавека да прыроды, непасрэдны працэс вытворства яго жыцця, а таксама і грамадскіх адносін яго жыцця і вызначаючых іх духоўных уяўленняў». (Маркс).

Тав. Сталін, як лепшы пераемнік, як лепшы з лепшых учэлесніцелаў усіх ідэй марксізма-ленінізма ставіць поспехі социялістычнага будаўніцтва ў прамую залежнасць ад развіцця тэхнікі ў нашай краіне на асобных этапах социялістычнага будаўніцтва.

«Мы прышлі да ўлады ў краіне, тэхніка якой з'яўляецца вельмі адсталай... А між тым, мы маем вакол сябе цэлы рад капіталістычных краін, авалодваючых значна больш развітай і дасканалай прамысловай тэхнікай, чым наша краіна...

Мы дагнялі і перагналі перадавыя капіталістычныя краіны ў сэнсе ўстанаўлення новага палітычнага ладу, совецкага ладу. Гэта добра. Але гэтага мала.

Для таго, каб дабіцца канчатковай перамогі социялізма, трэба яшчэ дагнаць і перагнаць гэтыя краіны таксама ў тэхніка-эканамічных адносінах. Або мы гэтага даб'емся, або нас затруць».

Гэтыя словы т. Сталіна, сказаныя ім на парозе рэконструктыўнага перыяда ў 1928 годзе. («Аб індустрыялізацыі краіны і правым ухіле ў ВКП(б)»), паслужылі баявой праграмай усёй нашай партыі на больш хуткаму стварэнню свайёй уласнай социялістычнай тэхнікі, тэхнікі такой высокай якасці, якая-б адпавядала нашым социялістычным вытворчым адносінам.

Рабочы клас, натхнёны ідэямі свайго лепшага інжынера тав. Сталіна, вырашыў гіганцкія задачы гэтнічнага пераўзбраення ўсёй нашай краіны.

За апошнія пяць год (першая пяцігодка і 1933 год) мы сапраўды стварылі тэхніку высокай социялістычнай якасці. За гэты год Совецкі Саюз пад кіраўніцтвам партыі, па ўказаннях генія сучаснасці т. Сталіна здолеў «спалучыць апошняе слова навукі і капіталістычнай тэхнікі з масавым аб'яднаннем свядомых работнікаў, творачых буйную social-ісцкую вытворчасць». (Ленін).

«Няма такой машыны, якую мы ў сваёй краіне не здолелі-б пабудаваць».

Што азначае гэтая гістарычная формула нашага Сталіна, пад кіраўніцтвам якога мы дабіліся гэтых поспехаў.

Яна азначае, папершае, тое, што наша совецкае машынабудаўніцтва аўладала ўсімі элементамі машыннай тэхнікі, што ў абшырнай памянклатуры машын, якія зараз вырабляюцца ў сусветнай тэхніцы, совецкае машынабудаўніцтва мае ўсіх прадстаўнікоў сучаснай канструкцыі.

Яна азначае, падругое, што наша social-ісцкая тэхніка ўжо зараз мае такія буйныя вытворчыя магутнасці, такія варштаты, такія спосабы апрацоўкі, такі багаты падбор вытворчых магутнасцей, пры якіх рабочыя Совецкага Саюза могуць вырабляць любую неабходную деталь, складаны элемент машыны, любую самую машыну.

Яна азначае, патрэцяе, што Совецкі Саюз, і толькі Совецкі Саюз, мае магчымасць пераключаць усю сваю складаную рознастайную вытворчую магутнасць, увесь свой аграмадны рост за гады першай пяцігодкі, social-ісцкі вопыт на розных участках — на вырашэнне новых задач. У процівагу капіталізму толькі СССР не ведае манаполіі патэнтаў, вытворчай сакрэтнасці і кан курэнцыі.

Яна азначае, пачацвертае, тое, што ў працэсе стварэння і асваення social-ісцкай тэхнікі прымаюць удзел мільённыя масы рабочых, калгаснікаў і ІТР. Іменна іх творчая ініцыятыва, іх героізм ў аўладанні вышынямі навейшай тэхнікі — матэрыялізуюцца ў кожным элементе совецкай машыны.

Яна азначае, нарэшце, што «вызваленне сродкаў вытворства ад капіталістычных акоў з'яўляецца адзінай папярэдняй умовай бесперапыннага, усё больш паскараючага развіцця прадукцыйных сіл» (Энгельс).

Мы зараз у поўнай меры маем права з гонарам заявіць, што ні адна з еўрапейскіх капіталістычных краін не авалодвае такой паўнацэннай, такой найшырэйшай разгалінаванасці структуры вытворчасці як Совецкі Саюз.

Магутная энергія падаючай вады, энергія паветра, сонца, надзвычай рознастайныя, прыродныя выкапні і іншыя багацці — усё гэта зараз заклікана на службу social-ізма.

Толькі ў Совецкай краіне, кіруемай партыяй на чале з тав. Сталіным, рабочы клас, з уласцівай яму выключнай смеласцю большэвіцкага размаху — зрабіў генеральны наступ на лажаўшыя стагоддзямі над сушдом натуральныя рэсурсы, «вырваў іх ужо ў аграмадных маштабах з каменнага палону прыроды і запрог у сваю пераможную калясніцу».

На тэрыторыі адной шостай часткі земнага шара за апошнія пяць год з'явіліся аграмадныя, некаторыя з іх не маючыя сабе роўных у свеце, гіганты індустрыі, набудаваныя сапраўды паводле апошняга слова навукі і тэхнікі.

Тэхнічны пераварот ахапляе ўсе галіны народнай гаспадаркі, усе поры нашай грамадскай рэчаіснасці.

Другая пяцігодка дае новы гістарычны размах тэхнічнага ўзбраення.

«Асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў і класаў наогул, поўнае знішчэнне прычын, параджаючых класавую рознь і эксплуатацыю, і перамаганне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей, ператварэнне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў свядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага social-ісцкага грамадства».

Ажыццяўленне гэтых задач магчыма на базе рэконструкцыі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарта. Таму «асноўнай і рашаючай гаспадарчай задачай другой пяцігодкі з'яўляецца завяршэнне рэконструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі».

«Ажыццяўленне задач тэхнічнай рэконструкцыі прамысловасці патрабуе паслядоўнага асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцей, што павінна знайсці сваё адлюстраванне ў значным росце прадукцыйнасці працы і сур'ёзным зніжэнні сабекошту». (Тэзісы т. т. Молатава і Куйбышэва).

Асваенне тэхнікі — рашаючая ўмова завяршэння рэконструкцыі ў другой пяцігодцы. Ужо за гады першай пяцігодкі намеціўся рашучы зрух у разгорванні барацьбы шмат мільённых мас рабочых за аўладанне тэхнікай.

І ў гэтай справе, справе рашучага паваротту тварам да тэхнікі, справе кіраўніцтва рухам па аўладанню тэхнікай, кіраўніцтва новымі прадпрыемствамі — ідэя належыць тав. Сталіну.

У сваёй гістарычнай прамове «аб задачах гаспадарнікаў» (4 лютага 1931 г.) тав. Сталін кідае большэвіцкі заклік усёй партыі, усім гаспадарнікам, усім рабочым «авалодваць тэхнікай, усім рабочым «авалодваць тэхнікай», «закончыць з тэхнічнай устаноўкай неўмяшання ў вытворчасць».

«Мы зверглі капіталізм, мы ўзялі ўладу, мы пабудавалі буйнейшую social-ісцкую індустрыю, мы павячнулі серадняка на шлях social-ізма.

Самае важнае з пункту гледжання social-ізма мы зрабілі. Нам астаецца не многа: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. І калі мы гэта зробім, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх мы зараз не можам і марыць. І мы гэта зробім, калі мы захочам гэтага пасапраўднаму». (СТАЛІН).

Тав. Сталін рашучым чынам ставіць пытанне перад гаспадарнікамі, кіраўнікамі асобных вытворчых звеньняў «аўладаць тэхнікай, стаць самімі гаспадарамі справы».

Нельга зараз кіраваць вытворчасцю, не ведаючы ўсіх яе канкрэтнасцей, не ведаючы людзей на асобных участках.

«Пішыце копькі хочаце рэзалюцый, — гаворыць тав. Сталін, — звяртаючыся да гаспадарнікаў, кляніцеся яшчэ хочаце словамі, але калі вы не аўладаеце тэхнікай, эканомікай, фінансамі завода, фабрыкі, шахты — толку не будзе».

«Гаспадарнік, не жадаючы вывучаць тэхніку, не жадаючы аўладаць тэхнікай — гэта анекдот, а не гаспадарнік». Гэта тып балбатуна, аб якім красамоўна сказаў тав. Сталін на 17 з'ездзе.

Гэтыя словы т. Сталіна маюць выключна рашаючае значэнне. Пытанні аўладання тэхнікай, пытанні кіраўніцтва асобнымі звеньнямі гэтай новай тэхнікі набываюць рашаючае значэнне.

Зараз як ніколі востра стаіць пытанне аб ліквідацыі канцылярска-бюракратычных метадаў кіраўніцтва ва ўсіх звеньнях нашай работы.

Толькі пры такіх умовах можна выканаць аграмадныя задачы другой пяцігодкі, можна сапраўды пафас новага будаўніцтва, пафасам асваення новай тэхнікі і новых вытворчасцей, сур'ёзна павысіць прадукцыйнасць працы, сур'ёзна знізіць сабекошт і рашуча палепшыць якасць прадукцыі.

П. ШЧАДЗІСТАЎ.

# КУЛАЦКІ САБАТАЖ ІЛЬНАЗАГАТОВАК НЕ ЗЛОМЛЕН

## Рашуча перамагаючы дэмабілізацыйныя тэндэнцыі, дабіцца неадкладнага завяршэння задачы ільнапрадукцыі

Друкуемая намі зводка ходу загатовак ільнапрадукцыі паказвае далейшае пагаршэнне адставання БССР у выкананні гэтага адказнейшага задання.

Апошняя пяцідзённка дала прырост па рэспубліцы ўсяго толькі на 1,1 проц. Такім чынам, БССР з'яўляецца найбольш адстаючай па ільназагатоўках ва ўсім Совецкім Саюзе і адстае нават ад ганебных тэмпаў ільназагатовак мінулага года.

Аб прычынах такога адставання лепш за ўсё можна ўнаўніцца на практыцы работы Асвейскага раёна. Яшчэ да раённай партыйнай канферэнцыі сярод часткі не толькі сельскага, але і раённага актыва панавала думка аб тым, што «план перэальны, ільну больш няма».

На партыйнай канферэнцыі гэтыя тэндэнцыі былі крыху раскрытыкаваны. Пасля гучных прамоў была прынята пастанова аб завяршэнні загатовак ільну да з'езда партыі. Але, не гледзячы на гэту пастанову, гутаркі аб «перэальнасці планаў» не толькі не спынілася, але прасяклі і ў кіраўніцтва раённых партыйных і совецкіх арганізацый. У выніку кулацкі саботаж прыняў небывалыя размеры, ільназагатоўкі амаль зусім спыніліся. За апошнюю пяцідзённку Асвейскі раён дае прырост усяго на... 0,5 проц. Чым-жа інакш, як не патураннем кулацкаму саботажу, можна тлумачыць становішча ў Асвейскім раёне?

Яшчэ горш стаіць справа ў Чаўскім раёне. Тут на раённай партыйнай канферэнцыі кіраўнікі партыйнай арганізацыі запоўнілі ЦК КП(б)Б у тым, што прарыў у ільназагатоўках будзе ліквідаваны да з'езда партыі. Але партыйнае кіраўніцтва не здолела ператварыць гэту пастанову ў канкрэтныя большэвіцкія справы, не здолела мабілізаваць масы калгаснікаў і працоўных адзіначасобнікаў, у першую чаргу ўсёй партарганізацыі на перамаганне кулацкага саботажу. У выніку прырост за апошнюю пяцідзённку дасягае ўсяго толькі 1 проц.

Не зрабіла для сябе ніякіх вывадаў з неаднаразовых указанняў ЦК КП(б)Б і Мсціслаўскае раённае кіраўніцтва. Мсціслаўскі раён паранейшаму ідзе на адным з апошніх месц у БССР. Апошняя пяцідзённка дала ўсяго 1,2 проц. прыросту.

Зусім недапушчальнае адставанне наглядаецца па неільнаводных раёнах, асабліва па сістэме Белкаапсаюза. Раёны, абслугоўваемыя гэтай сістэмай, зусім спынілі загатоўкі ільнапрадукцыі. І гэта не выпадкова. Кіраўніцтва Белкаапсаюза пасля ўхвалення некалькіх гучных пастаноў самасунакоілася на 76 проц. і за апошні час ніякай практычнай работы на кіраўніцтву ільназагатоўкамі не вядзе.

Дэмабілізацыйныя тэндэнцыі раду цэнтральных і раённых арганізацый адразу знайшлі адбітак у калгасах і вёсках. Мяльна-сушыльныя пункты ў радзе месц зусім спынілі сваю работу. Прымацаваныя да пунктаў людзі перакінуты на іншыя работы.

Усе паданыя факты сведчаць аб тым, што ў радзе раёнаў замест разгрому кулацкага саботажу мясцовыя работнікі патураюць саботажнікам ільназагатовак.

Бязлітасна змагаючыся з кулацкім саботажам на ільназагатоўчым фронце і ўсякімі праяўленнямі парушэння рэволюцыйнай законнасці, мы павінны ў бліжэйшыя-ж дні дабіцца такога пералому, які-б забяспечыў неадкладнае завяршэнне ільназагатовак.

# ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК ІЛЬНАВАЛАКНА І ПЯНЬКІ

*на 1 лютага ў процантах*

**Па ільнаводных раёнах**

| РАЁНЫ | Загатоўлена: Ільнавалакна | Загатоўлена: Пянька |
|---|---|---|
| Сенненскі | 106,9 | — |
| Полацкі | 101,4 | — |
| Дрысенскі | 100,3 | — |
| Бешанковіцкі | 96,0 | — |
| Шклоўскі | 95,7 | 17,3 |
| Чашніцкі | 93,3 | — |
| Сіроцінскі | 90,3 | — |
| Вушацкі | 88,7 | — |
| Гарадоцкі | 86,1 | — |
| Лепельскі | 85,2 | 6,2 |
| Крупскі | 83,8 | 37,4 |
| Бялыніцкі | 83,7 | 32,3 |
| Суражскі | 83,6 | — |
| Талочынскі | 83,5 | 9,1 |
| Расонскі | 79,6 | — |
| Дубровенскі | 79,3 | 7,0 |
| Асвейскі | 75,7 | — |
| Лёзненскі | 74,1 | — |
| Чавускі | 68,0 | 73,1 |
| Мсціслаўскі | 67,0 | 3,1 |
| Горацкі | 53,2 | 10,6 |
| Усяго па ільнаводных раёнах | 83,7 | — |

**Па неільнаводных раёнах**

| РАЁНЫ | Загатоўлена: Ільнавалакна | Загатоўлена: Пянька |
|---|---|---|
| Хойніцкі | 109,9 | 31,9 |
| Любаньскі | 108,5 | 102,4 |
| Чырвонаслабодскі | 105,6 | 71,4 |
| Старобінскі | 100,3 | 50,0 |
| Віцебскі | 100,0 | — |
| Спуцкі | 98,3 | 72,9 |
| Копыльскі | 96,5 | 47,8 |
| Менскі | 96,5 | — |
| Старадарожскі | 95,4 | 54,3 |
| Асіпавіцкі | 95,2 | 100,0 |
| Рагачоўскі | 94,9 | 71,8 |
| Бабруйскі | 92,4 | 47,6 |
| Тураўскі | 91,9 | 70,0 |
| Пухавіцкі | 91,0 | 45,4 |
| Смалявіцкі | 90,5 | 127,5 |
| Уздзенскі | 87,1 | 113,8 |
| Аршанскі | 85,0 | 100,5 |
| Чэрвеньскі | 85,0 | 111,5 |
| Глускі | 84,9 | 69,2 |
| Брагінскі | 84,3 | 23,2 |
| Барэзінскі | 83,8 | 110,7 |
| Макілеўскі | 83,1 | 21,5 |
| Мазырскі | 80,6 | 82,6 |
| Жлобінскі | 78,3 | 61,1 |
| Парыцкі | 77,8 | 56,8 |
| Быхаўскі | 75,8 | 60,5 |
| Церахоўскі | 75,3 | 43,0 |
| Заспаўскі | 73,6 | 71,4 |
| Уваравіцкі | 73,3 | 20,6 |
| Чарыкаўскі | 73,2 | 46,0 |
| Рэчыцкі | 73,2 | 38,8 |
| Чачэрскі | 72,7 | 38,3 |
| Барысаўскі | 72,7 | 108,5 |
| Дзяржынскі | 70,7 | 26,0 |
| Ельскі | 70,2 | 75,8 |
| Клічаўскі | 68,3 | 34,4 |
| Веткаўскі | 66,3 | 26,3 |
| Лагойскі | 67,9 | 70,7 |
| Кармянскі | 67,9 | 39,3 |
| Петрыкаўскі | 66,2 | 63,4 |
| Касцюковіцкі | 64,3 | 25,3 |
| Буда-Кашалёўскі | 61,6 | 42,6 |
| Чырвонаармейскі | 61,5 | 12,0 |
| Крычаўскі | 59,3 | 18,2 |
| Лельчыцкі | 59,0 | 52,0 |
| Брагінскі | 58,0 | 89,0 |
| Гомельскі | 57,0 | 5,7 |
| Жыткавіцкі | 55,4 | 58,3 |
| Нараўлянскі | 49,6 | 47,9 |
| Прапойскі | 45,2 | 12,6 |
| Лоўскі | 44,8 | 19,7 |
| Плашчаніцкі | 43,9 | 54,3 |
| Клімавіцкі | 38,3 | 17,5 |
| Камарынскі | 36,6 | 88,0 |
| УСЯГО па БССР | 81,1 | 51,7 |

# ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ ПЛАНАЎ ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

Не гледзячы на рад пастаноў ЦК КП(б)Б і Саўнаркома БССР, дагэтуль няма рэзкага пералому ў ходзе загатовак і вывазкі лесу.

За студзень трэба было выканаць не менш 40 проц. квартальнага плана. Аднак, на 1 лютага план па загатоўках дзелавой драўніны выкананы на 33,4 проц., дроў — 23,8., на вывазцы дзелавой драўніны — на 27,4 проц. і дроў — на 30. Выкананне плана зусім незадавальняючае.

Рад раёнаў і леспрамгасаў, у першую чаргу Горацкі, Глускі, Гомельскі, Крычэўскі, Крупскі, Мазырскі, Парыцкі, Рагачоўскі, Петрыкоўскі, Чачэрскі і інш., кіраўніцтва якіх не раз было папярэджана ЦК партыі і ўрадам, працягваюць ганебна гіпставаць і зрываць выкананне плана загатовак і вывазкі лесу.

Кожны з гэтых раёнаў у сярэднім выканаў квартальны план вывазкі дзелавой драўніны не больш чым на 19-20 проц., а некаторыя яшчэ менш.

Дзе прычыны незадавальняючага ходу загатовак і вывазкі лесу?

Амаль усюды ў даным выпадку пачынаюць спасылацца не недахват рабочай сілы і возчыкаў. — Тут, — стаяць быць сабе ў групі сумленныя і несумленныя балбатуны, — корань зла. Але ўсё гэта, вядома, не так. Трэба проста заявіць, што рабочай сілы і возчыкаў амаль ва ўсіх раёнах больш чым дастаткова. Усё пытанне ў тым, як яны скарыстоўваюцца. Скарыстанне-ж гэтай рабочай сілы вельмі дрэннае, а гэта азначыць, што прадукцыйнасць працы на лесазагатоўках, асабліва па вывазцы лесу, надзвычай нізкая.

Кожны возчык звычайна мае норму вывазкі. Але на прыкладзе Азеранскага ўчастка, Рагачоўскага леспрамгаса, Прыбарокага — Быхаўскага леспрамгаса, Любоўніцкага — Бабруйскага леспрамгаса і інш. вільць, што нормы гэтыя выконваюцца не больш чым на 25-50 проц. Ні леспрамгас, ні сельсоветы і калгасы не праяўляюць выканання норм. У результаце пры парэфальна вялікай колькасці возчыкаў атрымліваецца зусім нязначнае выкананне плана.

Арганізацыя працы на лесавывазцы з'яўляецца адным з адстаючых участкаў. Шматлікія брыгады возчыкаў, якія лічацца на вестках леспрамгасаў, на справе зусім не існуюць, або ў лепшым выпадку складаюцца... з аднаго брыгадзіра. Так, на прыклад, абстаўшы справа ў Любоўніцкім участку, Бабруйскага леспрамгаса.

Возьмем пытанне аб дагаворах з калгасамі і працоўнымі аднаасобнікамі на загатоўкі і вывазку лесу. Заключэнне гэтых дагавораў у радзе раёнаў і сельсоветаў было праведзена фармальна. У памянёным вышэй Прыбарокім участку ў заключаных дагаворах не адзначыўся, як атрымліваюць калгаснікі плату за вывазку лесу — наяўнымі грашыма ці працадзнямі. Гэта «забыўлівасць» ці проста фармальна-бюракратычныя чыноўніцкія адносіны да важнейшай справы прывялі к таму, што калгаснікі не ведаюць, што яны павінны атрымаць за сваю работу.

Масавая работа ў заняпадзе. На самой справе, калі ўзяць пытанне аб невыкананні норм, то тут, як на далоні вільць брудная кулацкая работа. Кулацкае ахвосце зараз не скажа прама калгаснікам і працоўнаму аднаасобніку, што ты, моў, не выязджай на лесараспрацоўкі, не выконвай дагавор. Класавы зораг дзейнічае інакш, ён угаварвае не выконваць поўнасцю нормы і такім чынам зрывае лесавывазку. У даным выпадку у масавая работа, асноўная на растлумачэнні возчыку, калгаснику і працоўнаму аднаасобніку аднаведных пунктаў дагавора, пытанасці для яго поўнага выканання нормы, прадугледжаных заахвочэнняў за такое выкананне. — такая работа нашесла-б моцны ўдар па кулацкай агітацыі. Але малая работы, на вялікі жаль, амаль не вядзецца.

Трэба адзначыць, што ў значнай большасці леспрамгасаў прафсаюзныя арганізацыі працуюць дрэнна. Дрэнна працуе, ці, больш пэўна кажучы, зусім не працуе ў лесе комсамол. Нездавальняючае яшчэ арганізавана снабжэнне лесарубаў і возчыкаў.

Падсумоўваючы ўсё гэта, мы павінны адзначыць, што леспрамгасы дагэтуль не перабудавалі сваёй работы, за што значную частку віны нясе трэст Лесбел (кіраўнік тав. Шапіра), а часткова і ўпаўнаркамлес.

Лесбел не ведае сапраўднага становішча на месцах і не ажыццяўляе канкрэтнага аперацыйнага кіраўніцтва леспрамгасамі. Бегатня і мітусня, адсутнасць большэвіцкага тарадку — вось што характэрна для практыкі кіраўніцтва Лесбела. Даволі часта ў кіраўніцтве Лесбела аказваецца што «яны мабілізаваліся, пастанілі пытанне рубам, у іх і пералом, а справа не рушыцца з месца» (Сталін). За прыкладам далёка не трэба хадзіць.

Некаторы час таму назад з апарата Лесбела і ўпаўнаркамлеса ў леспрамгасы ў якасці ўпаўнаважаных і брыгадзіраў былі накіраваны 43 чал. Вось некалькі прыкладаў, з дазволу сказаць, «работы» гэтых упаўнаважаных. Дырэктар Бабруйскага хімлесгаса Гальфанд быў накіраваны у Парыцкі леспрамгас. Замест 3 стуцдзня ён з'явіўся на месца 10-та і. прабыўшы там адзін дзень, паехаў назад. Работнік апарата ўпаўнаркама леса Сартан знаходзіцца ў Мазырскім леспрамгасе, аднак леспрамгас увесь час у ліку адстаючых. Зараз ён — у Гомельскім леспрамгасе, але Гомельскі раён выканаў квартальны план вывазкі дзелавой драўніны ўсяго на 21,3 проц., Веткаўскі — 21,5 проц., а Лоеўскі — 14,6 проц. Каментарыі, як кажуць, не патрэбны.

Неабходна неадкладна дабіцца рэзкага і крутога пералому ў ходзе загатовак і вывазкі лесу. План павінен быць выкананы своечасова і поўнасцю як на загатоўках, так і на вывазцы, а таксама і на ўсіх відах лесаматэрыялаў.

Адстаючыя раёны павінны прыняць усе меры для таго, каб у самы найкарацейшы тэрмін нашаніць упушчанае, і дабіцца выканання плана. Райкомы і райвыканкомы, партыйныя ячэйкі і сельсоветы павінны паболшэвіцку ўзяцца за загатоўкі і вывазку лесу. Грош цана ўсім запэўненням і трасткучым рэзалюцыям, калі яны не будуць падмацаваны канкрэтнай справай. Адстаючыя павінны памятаць, што партыя не пацерпіць, каб не дыярктывы не выконваліся, і будзе моцна біць вінаватых у гэтым, не зважаючы на асобы.

Раённыя арганізацыі і ў першую чаргу леспрамгасы абавязаны ўлічыць, што галоўнае зараз, што вырашае поспех справы — гэта арганізацыя і прадукцыйнасць працы.

Барацьба за поўнае выкананне задач норм павінна легчы ў аснову работы па ўзнаўленні прадукцыйнасці працы. Ліквідаваўшы на хаду недахопы фармальнага заключэння дагавораў, трэба неадкладна палатаніць самую дасканалую і штодзённую праверку выканання дагавораў, прыцягваючы вінаватых у невыкананні іх да суровай адказнасці. Шырока разгарнуць масавую работу, даючы бязлітасны адпор кулацкаму ахвосцю ў яго спробах сарваць загатоўкі і вывазку лесу. Больш увагі і клопатаў аб бытавых патрэбах лесарубаў і возчыкаў.

Раз і назаўсёды пакончыць з метадамі канцылярска-бюракратычнага кіраўніцтва ў апараце Лесбела, калёным жалезам тыпаліць у ім бюракратызм, вышаць алтуль балбатуноў, якія зрываюць справу. Лесбел павінен перабудаваць сваю работу і забяспечыць жывое, аператыўнае практычнае

# ФРАНЦУЗСКІ МЕМАРАНДУМ

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА).

Апублікаваў французскі мемарандум, перададны Гітлеру французскім паслом у Берліне Понсе. Французскі ўрад выказвае здавальненне па поваду намера германскага ўрада заключыць пакты аб ненападзе з усімі сваімі суседзямі.

Разам з тым указваецца, што Францыя лічыла-б пажаданым заключэнне такога роду пактаў толькі пры той умове, калі ні ў якай меры не будуць аслаблены ўстаноўленыя існуючымі дагаворамі гарантыі бязпаспасці і будуць даны новыя гарантыі незалежнасці Аўстрыі і ўстрымання ад умяшання ў яе ўнутраныя справы. Адзначаючы, што Германія прыняла прынцып перыядычнага і аўтаматычнага кантролю над узбраеннямі, мемарандум ставіць пытанне, ці намерана Германія далучыцца да практычных мерапрыемстваў, намечаных у апошні час у Жэневе.

Далей мемарандум падкрэслівае, што германскія патрабаванні аб даўзбраеннях прама процілеглы мэтам канферэнцыі па раззбраенню, а таксама фармулёўкам, прынятым пры згодзе Германіі. У якасці прыклада прыводзіцца патрабаванне Германіі аб прадастаўленні ёй права павялічэння пастаяннай арміі да 300 тыс. чалавек, пры наяўнасці значных кадраў паліцыі, «ваенны характар якой, бясспрэчна, прызнан канферэнцыяй па раззбраенню», а таксама ваенізаваных арганізацый.

Такім-жа супярэчным духу дзейнасці канферэнцыі па раззбраенню патрабаваннем мемарандум лічыць патрабаванне Германіі аб прадастаўленні ёй права неадкладнага колькаснага і якаснага даўзбраення.

Мемарандум канстатуе таксама разгалоссе паміж французскай і германскай пазіцыяй па пытанню аб ажыццяўленні кантролю. Германія, згаджаючыся ў прынцыпе на ажыццяўленне кантролю, пакідае адкрытым пытанне аб тэрміне дзеяння кантролю, тым часам лаяльнае прымяненне канвенцыі залежыць іменна ад устанаўлення гэтага тэрміну і разультатаў правядзення кантролю. Такім чынам, у афіцыёзным паведамленні гаворыцца: Германія выставіла поўную праграму даўзбраення, санкцыянаванне якой у канвенцыі выклікала-б гонку даўзбраенняў.

Гэтай германскай праграме Францыя процівіставіла план, які ўрэшце зводзіцца да значнага абмежавання ўзбраенняў і дасягнення поўнага роўнапраўя паміж краінамі. Францыя была-б гатова ў першыя-ж гады пасля заключэння канвенцыі па раззбраенню скараціць колькасны склад арміі пры ўмове рэарганізацыі зараз існуючых у Германіі ўзброеных сіл. Францыя была-б гатова падпісаць канвенцыю, прадугледжваючую абмежаванне ўзбраеняў па сучасным узроўні і забарону вытворчасці зброі, калібр якой перавышае лік, устаноўлены канвенцыяй. У гэты перыяд трэба было-б таксама ажыццявіць ва ўсіх краінах кантроль над колькасным складам арміі, над вытворчасцю і імпартам узбраенняў.

Каб паказаць, якое значэнне Францыя прыдае раззбраенню, пра дугледжанаму на працягу другой фазы перыяда ажыццяўлення кантролю над узбраеннем, Францыя згадзілася-б на абмежаванне рухомай артылерыі калібрам у 150 мм. Паміма таго, Францыя згадзілася-б скараціць на 50 проц. матэрыяльную частку авіяцыі на працягу першых год дзеяння канвенцыі пры ўмове аднаведнага скарачэння авіяцыі ўсімі іншымі краінамі, ажыццяўлення дзейснага кантролю над грамадзянскай авіяцыяй і над авіяцыйнай прамысловасцю з тым, каб у далейшым замяніць нацыянальную авіяцыю пазасобных краін спецыяльнай арганізаванай між народнай авіяцыяй.

Такім чынам, — падкрэсліваецца ў мемарандуме, — Францыя ў процілегласць Германіі гатова пайсці на значнае скарачэнне ўзбраенняў, ставячы гэта пытанне ў залежнасць ад супрацоўніцтва Германіі. Разам з тым указваецца, што «Францыя ні ў якой меры не лічыць пажаданым зрабіць немагчымым працяг непасрэдных перагавораў з Германіяй».

У заключэнне мемарандум падкрэслівае, што большасць існуючых еўрапейскіх праблем пельга рашыць без зацікаўленых краін, і Лігі нацый і заклікае Германію вярнуцца да палітыкі міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках Лігі нацый.

# АДКАЗ ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 3 лютага. (БЕЛТА).

Германскі ўрад апублікаваў адказ на французскі мемарандум, перададны 19-га студзеня французскаму паслу ў Берліне Понсе. У асноўным адказ зводзіцца да наступнага: Германскі ўрад вітае гатоўнасць французскага ўрада ўступіць у непасрэдныя перагаворы з Германіяй для абмеркавання ўсіх спрэчных пытанняў. Германскі ўрад указвае, што асноўнымі пытаннямі, па якіх погляды абодвух урадаў разыходзяцца, з'яўляюцца пытанні аб колькасці германскай арміі і аб дапушчэнні для германскага рэйхсвера абаронных відаў узбраення.

Германскі ўрад лічыць, што 300 тыс. чалавек для рэйхсвера значна ніжэй таго ўзроўню, які павінен быў быць устаноўлен, калі-б за Германіяй сапраўды было прызнана роўнапраўе ва ўзбраеннях. Калі нават будучая германская армія будзе налічваць 300 тыс. чалавек, будзе рэарганізавана ў армію з кароткатэрміновай службай і атрымае неабходныя для повага тыну арміі абаронныя віды ўзбраенняў, то і талы Францыі і іншыя высока ўзброеныя дзяржавы будуць мець велізарныя перавагі ў адносінах узбраенняў. Пры гэтых абставінах адхіленне германскіх патрабаванняў можа толькі азначаць, што за Германіяй не хочуць прызнаць роўнапраўя.

Лічачы, што праблемы раззбраення не могуць быць вырашаны толькі шляхам перагавораў паміж Германіяй і Францыяй, германскі ўрад усё-ж думае, што пагадненне паміж Германіяй і Францыяй па прынцыповых пытаннях аблягчыла-б агульныя перагаворы аб раззбраенні. Гатоўнасць Германіі прыняць удзел у міжнародным супрацоўніцтве выцякае і не прапановы аб заключэнні пактаў ненападу. Знешняя форма гэтага супрацоўніцтва вызначыцца толькі ў будучым.

Указваючы, далей, што Францыя мае значныя вайсковыя часці ў Афрыцы, адкуль у любы час яны могуць быць перакінуты на кантынент, германскі ўрад патрабуе, каб гэтыя афрыканскія войскі былі ўлічаны пры вырашэнні пытання аб колькасці французскай арміі.

Метад скарачэння наветраных узброеных сіл, які прапануецца французскім мемарандумам, выклікае сумненні германскага ўрада, паколькі Францыя адмаўляецца ад прынцыпа парытэта паветраных флотаў вялікіх дзяржаў.

Апрача таго, калі Германіі не будзе дазволена мець свой ваенны паветраны флот, праграма скарачэння паветраных сіл іншых дзяржаў нічога ще змяніць ў нераўнасці і поўнай бязабаронасці Германіі ў паветры. Мяркуемы французскі мемарандум кантроль над узбраеннямі можа аказаць рознае дзеянне ў адносінах краін высокаўзброеных і краін раззброеных па Версальскаму дагавору. Гэты кантроль можа знайсці больш шырокае прыстасаванне да астатніх краін і даць повад да расчараванасцей, якія могуць быць скарыстаны для антырэнўкі раззбраення і ўступлення ў дзеянне канвенцыі. Але нават калі-б такая небяспека і была адхілена, для германскага ўрада рашаючым пытаннем з'яўляецца наступнае — ці пагодзіцца прадаўжацца і далей лыскры мінацыя Германіі?

Германія, сумяшчаецца, ці сапраўды будзе забяспечана прапануемым Францыяй шляхам вырашэння праблемы раззбраення і захаванымі мэтамі. Таму германскі ўрад не бачыць другога выхаду са становішча, якое стварылася, як абмежаванне ўзбраеняў высокаўзброеных дзяржаў іх цяперашнім узроўнем і ажыццяўлення германскага роўнапраўя ў галіне ўзбраення.

Прапанова германскага ўрада павялічыць колькасны склад рэйхсвера да 300 тыс. чалавек не можа лічыцца зыходнай вялікай, калі ўлічыць геаграфічнае становішча Германіі. Апрача таго, у Германіі няма резервовых частак, а існуючыя палітычныя арганізацыі не маюць ваеннага характару. Германія дапусціла абязпечаны кантроль над сваімі арганізацыямі штурмавікоў і ахоўных дружын толькі пры ўмове, калі тое самае будзе зроблена ў адносінах да падобных-жа арганізацый іншых краін. Пытанне аб колькасці паліцэйскіх сіл можа быць лёгка вырашана на аснове ўліку колькасці насельніцтва, сацыяльных адносін і іншых умоў асобных дзяржаў.

У заключэнне германскі мемарандум ставіць французскаму ўраду наступныя 13 пытанняў.

1. У якім памеры мяркуецца скарачэнне колькасных сцей французскіх войск у метраполіі і ў калоніях?

2. Якім чынам будуць прыняты ў рахунак пры прадугледжаемым французскім мемарандумам рэгуляванні колькасных сцей войск французскія каланіяльныя войскі і рэзервы?

3. Ці згаджаецца Францыя не прыцягваць і не рэкамендаваць на кантынеце ні ў перыяд вайны, ні ў мірны час каланіяльныя войскі?

4. Што будзе зроблена з артылерыяй калібрам вышэй 16 см. і ці будзе яна знішчана?

5. Які максімальны тонаж устаноўлюецца для танкаў і што будзе зроблена з танкамі, перавышаючымі гэты тонаж?

6. Ці мае французскі ўрад на ўвазе колькасныя абмежаванні асобных відаў зброі для ўсіх краін і якіх іменна?

7. Якія будуць сродкі ўзбраення тых французскіх войск, на якія не распаўсюджваецца уніфікаваная сістэма армій?

8. На працягу якога часу будзе правестана 50-процэнтнае скарачэнне наветранага флота, што будзе зроблена з выключальнымі самалётамі і ці будуць яны знішчаны?

9. У чым будзе выяўляцца прапануемы Францыяй кантроль над гражданскім наветраным флотам і будучымтам самалётаў?

10. Ці будзе ў канвенцыі ўстаноўлен пэўны тэрмін для знішчэння наветранага ваеннага флота і якая даўжыня гэтага тэрміну?

11. Ці мяркуецца, што забарона бамбардзіровак будзе ўсеагульнай і безумоўнай, ці будуць устаноўлены якія-небудзь канкрэтныя выключэнні?

12. Ці трэба разумець прадугледжаемы мемарандумам кантроль над ваеннымі матэрыяламі такім чынам, што Францыя гатова ўвесці кантроль толькі свае ваенныя матэрыялы, ці гэты кантроль пашыраецца таксама і на ваенныя матэрыялы, што знаходзяцца на складах і ў распараджэнні войск?

13. Якая пазіцыя французкага ўрада ў адносінах да морских узбраеняў?

# НОТА ГЕРМАНІІ АЎСТРЫЙСКАМУ ЎРАДУ

БЕРЛІН, 3 лютага (БЕЛТА).

Пасля таго, як аўстрыйскі ўрад прызнаў нездавальняючым германскі адказ на яго пратэст супроць умяшання Германіі ва ўнутраныя справы Аўстрыі, германскі ўрад апублікаваў новую ноту.

У ёй гаворыцца, што ў германа-аўстрыйскіх адносінах справа ідзе не аб канфлікце паміж двума нямецкімі дзяржавамі, а аб «разыходжаннях паміж аўстрыйскім урадам і гістарычным рухам усяго нямецкага народа».

У ноце указваецца, далей, што «пачуццё духоўнай агульнасці народаў не знішчаецца наяўнасцю палітычных граніц паміж імі».

У тоне адкрытай пагрозы па адрасу Аўстрыі нота прадаўжае: «Няхай аўстрыйскі ўрад не чакае, што Германія будзе спакойна наглядаць за дзеяннямі ўрадавай сістэмы, якая прыдушае ўсё, што напаўняе германскі народ новай жужнасцю і надзеяй. Германскі ўрад рэкамендуе аўстрыйскаму кансці да згоды з нацсоцпартыяй Аўстрыі».

Нота выказвае нездавальненне тым, што Дольфус «без сур'ёзных падстаў» адхіліў пасрэдніцтва з боку высланага ў свой час з Аўстрыі кіраўніка аўстрыйскіх нацыянал-соцыялістаў германскага грамадзяніна Габіхта.

У заключэнне, указваючы на тое, што аўстрыйскі ўрад адночасова са сваім шагам у Берліне звярнуўся таксама і да іншых урадаў і намеран звярнуцца да Лігі нацый, — германская нота ўскладае адказнасць за гэты шаг на аўстрыйскі ўрад, падкрэсліваючы, што «аўстрыйская праблема не падлягае міжнароднаму абмеркаванню і не можа быць вырашана на гэтым шляху».

***

ВЕНА, 3 лютага (БЕЛТА).

Наладжаны 2-га лютага паход арганізацый кулацкага «Ландбунда» Ніжняй Аўстрыі на Вену закончыўся мітынгам, на якім Дольфус заклікаў да барацьбы з нацыянал-сацыялістамі і абвінавачваў урад Гітлера ў тым, што ён дапамагае росту нацыянал-соцыялістскага тэрора ў Аўстрыі.

Дольфус ахарактарызаваў выступленне аўстрыйскага ўрада ў Берліне, як апошнюю спробу да згоды, якая, праўда, падарвала крах.

—Вось чаму, — заявіў Дольфус, — аўстрыйскі ўрад «будзе прадаўжаць ісці па шляху абароны незалежнасці Аўстрыі.

# ДЗІМІТРАЎ, ПАПОЎ І ТАНЕЎ ПЕРАВЕДЗЕНЫ Ў БЕРЛІН

ЛОНДАН, 3 лютага. (БЕЛТА).

Усе газеты публікуюць па відным месцы паведамленні аб пераводзе Дзімітрава, Папова і Танева з лейпцыгскай турмы ў Берлін.

Газеты падкрэсліваюць грубае абыходжанне з маткай Дзімітрава і іншымі сваякамі зняволеных і выказваюць думку, што перавод зняволеных у Берлін сведчыць, што германскія ўлады не намераны вызваліць іх.

Берлінскі карэспандэнт «Дэйлі тэлеграф» падкрэслівае, што перавод Дзімітрава, Папова і Танева ў Берлін адбыўся ў момант, калі ў Германіі няма ніводнага замежнага абаронцы, які мог-бы абараніць іх інтарэсы. Згодна вестак, з Лондана ў Берлін для абароны інтарэсаў зняволеных выязджае грамадскі дзеяч Стрэды. «Манчэстэр гардыян» у артыкуле піша: «Самыя непраўдападобныя рэчы ўжо здарыліся і прадаўжаюць здарацца ў Германіі. Усе памятаюць аб пагрозе Герынга».

***

ЛОНДАН, 3 лютага. (БЕЛТА).

Газеты падаючай скептычна расцэньваюць даставерпасць германскіх паведамленняў, што чатыры арыштаваных нядаўна комуністычных актыністаў нелегальнай арганізацыі Берліна—Шар, Штэйнфур, Шэнхаар, Шварц былі забіты «пры спробе ўцякаць».

Усе берлінскія карэспандэнты лондонскіх газет лічаць афіцыяльную версію германскіх улад аб абставінах, пры якіх адбылося забойства 4-х комуністаў, зусім непраўдападобнай.

# ПАХАВАННЕ ЗАГІНУЎШЫХ ГЕРОЯЎ СТРАТАСФЕРЫ У ЗАЛІ ЦВК СССР

Учора пролетарская Масква хавала мужных герояў стратасферы т.т. Федасеенка, Васенка і Усыскіна.

Яшчэ з вечара 1 лютага урны з прахам загінуўшых былі пастаўлены ў Вялікую залу будынка ЦВК СССР, упрыгожаную жалобнымі сцягамі. У 12 гадзін ночы сталі прыходзіць для апошняга развітання саратнікі загінуўшых герояў і шматлікія працоўныя Масквы.

Зранку 2 лютага дзесяткі тысяч чалавек, маўкліва развітваючыся з загінуўшымі барацьбітамі совецкага лётніцтва, праходзяць праз залу. Доўгія рады выцягнуліся па лесвіцах і працягнуліся далёка ўздоўж будынка к Нікольскай вуліцы.

***

У вялікай зале будынка ЦВК СССР на высокім пастаменце — урны з прахам, упрыгожаныя жывымі кветкамі. Мноства вянкоў. Рэволюцыйны Совет Саюза ССР, Галоўнае Кіраўніцтва грамадзянскай авіяцыі, Ваенна-інжынерная акадэмія РСЧА, Цэнтральны совет Асавіяхіма, Інстытут аэралогіі, эскіпаж, канструктары і арганізатары палётаў стратастата «СССР» палажылі вянкі.

Каля партрэтаў загінуўшых, на маленькіх падушках ордэны Леніна — вышэйшая ўзнагарода Совецкага ўрада. Каля партрэта Федасеенка, апрача ордэна Леніна — ордэн Чырвонага Сцягу, заваяваны ім у баях з ворагамі пролетарскай дыктатуры ў часе грамадзянскай вайны.

Бясшумна змяняецца ганаровая варта каля урны, бясшумна праходзяць пад жалобны марш аркестра дзесяткі тысяч людзей.

У ганаровай варце — дэлегаты рабочых маскоўскіх заводаў і фабрык, асавіяхімаўцы, курсанты маскоўскага ваенна-морскага пункта Асавіяхіма, лепшыя ўдарнікі вытворчасці і абароны, работнікі навукі, тэхнікі і культуры. Яны прынеслі сюды, у гэтую залу не толькі боль утраты, але і цвёрдую непахісную веру ў сілы, у невычэрпныя творчыя здольнасці пролетарыята.

Разам з шматлікімі прадстаўнікамі фабрык і заводаў у ганаровай варце т.т. Эйдэман, Алксніс, акадэмік. Іофе, праф. Малчанаў, праф. Тэр-Оганесаў, першыя совецкія даследчыкі стратасферы тт. Пракоф'еў, Бірнбаум, Гадуноў і інш.

***

К 4-м гадзінам у залу прыходзяць т.т **СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, ОРДЖАНІКІДЗЕ, КІРАЎ, КАСІОР, ПОСТЫШАЎ, МІКАЯН, ПЯТРОЎСКІ, ГАМАРНІК, ЯРАСЛАЎСКІ, ЕНУКІДЗЕ, КІСЯЛЁЎ**, члены прэзідыума XVII з'езда, члены ЦК, ЦВК СССР і інш.

4 гадзіны. Таварышы Сталін, Молатаў, Варашылаў, Кіраў, Мікаян, стаяць у ганаровай варце, аддаючы апошні доўг героям совецкай аэранаўтыкі, барацьбітам за совецкую навуку. Аркестр выконвае жалобны марш...

У 4 г. 10 мінут саратнікі загінуўшых герояў стратасферы т.т. Пракоф'еў, Бірнбаум і Гадуноў выносяць урны з прахам з залы. Ад будынка ЦВК СССР да маўзалея Леніна ўрны нясуць т.т. Сталін, Молатаў, Варашылаў.

Красная плошча перапоўнена дзесяткамі тысяч ударнікаў прадпрыемстваў і працоўных сталіцы. На трыбунах каля Крэмлеўскіх сцен делегаты XVII з'езда партыі. Ганаровая варта з найсковых часцей маскоўскага гарнізона нерухомымі шчыльнымі шэрэнгамі стаіць каля маўзалея. Схіліўся жалобныя сцягі.

Пачынаецца жалобны мітынг.

На трыбуну маўзалея падымаюцца т.т. Сталін, Каганові, Молатаў, Варашылаў, Орджанікідзе, Кіраў, Касіор, Мікаян, Постышаў, Пятроўскі, Гамарнік, Енукідзе, Кісялёў, Яраслаўскі, Алксніс, Эйдэман, Будзённы, Позерн, Пракоф'еў, праф. Малчанаў і інш.

Саршыня камісіі па пахаванню т. Кісялёў абвяшчае жалобны мітынг, прысвечаны памяці загінуўшых герояў — ударнікаў заваявання стратасферы — т.т. **Федасеенка, Васенка і Усыскіна** — адкрытым Слова прадаўжаецца сакратару ленінградскага абкома ВКП(б) тав. Позерну, які выступае ад імя XVII з'езда ВКП(б) і ленінградскай арганізацыі большавікоў.

— Ад імя XVII з'езда ВКП(б),— гаворыць тав. Позерн, — мне даручана выказаць пачуцці глыбокага жалю па поваду гібелі трох адважных заваёўнікаў стратасферы. Адначасова з'езд даручыў мне выказаць пачуцці найвялікшага захаплення бліскучай перамогай маладых даследчыкаў стратасферы, выпеставаных Кастрычніцкай рэволюцыяй і смела падняўшыхся, рыскуючы жыццём, на нябачаную вышыню.

Імёны Федасеенка, Васенка і Усыскіна ўвойдуць і ўжо ўвайшлі ў спіс найслаўнейшых гераічных імён заваёўнікаў стратасферы. Яны загінулі, але дасягнулі найбольшай вышыні і праклалі шлях для новых перамог навукі і тэхнікі.

XVII з'езд вялікай ленінскай Комуністычнай партыі з найвялікшым захапленнем выслухаў радыёграму атрыманую з вышыні ў 20.600 метраў, з якой адважныя смельчакі віталі з'езд і вялікага правадыра партыі і сусветнага пролетарыята тав. **Сталіна**. З'езд кіраўнікоў соцыялістычнай будоўлі бурна апладыраваў гэтаму прывітанню. І ўжо на наступны дзень, калі прышло паведамленне аб гібелі стратастата, увесь з'езд, схіліўшы галовы, ушанаваў памяць адважных заваёўнікаў стратасферы.

Ад імя ленінградскіх пролетарыяў і працоўных г. Леніна, дзе вырасслі і адкуль спарадзіліся ў палёт тры адважных барацьбіты, выказаваў глыбокі жаль з прычыны іх гібелі. Гэты жаль падзяляюць дзесяткі мільёнаў людзей нашай краіны. Гэты жаль падзяляюць мільёны працоўных і за межамі Совецкага Саюза.

Гібель трох герояў не спыніць далейшых спроб такіх жа смелых заваяванняў у вобласці стратасферы.

Загінуўшыя таварышы выканалі свой доўг перад пролетарыятам нашай краіны, свой доўг перад сусветнай пролетарскай рэволюцыяй.

Наступным выступае старшыня ЦС Асавіяхіма СССР т. **Эйдэман**.

— Сёння крэмлеўская сцяна комунараў, — гаворыць ён, — прыме тры урны з прахам герояў — заваёўнікаў стратасферы. Энтузіясты гэтай справы—т.т. Федасеенка, Васенка і Усыскін — сканструявалі стратастат сваёй сістэмы, пабудаваўшы яго на сродкі, сабраныя сярод працоўных, сярод асавіяхімаўскай грамадскасці. Яны былі глыбока адданы навуцы і ў палёт ішлі не як шукальнікі прыгод, а як барацьбіты за навуку і тэхніку. Аб гэтым сведчаць запісы, зробленыя імі ў часе палёту і астаткі навуковых прылад. З вышыні 20.600 метраў яны віталі нашага вялікага любімага правадыра тав. Сталіна, імя якога з'яўляецца сцягам барацьбы за новыя дасягненні ў навуцы, сцягам барацьбы за соцыялізм.

Мільёны людзей схіляюць сёння галовы над прахам загінуўшых. Непераможна тая краіна і той клас, якія вылучаюць такіх адважных і адданых барацьбітоў, якімі былі т.т. Федасеенка, Васенка і Усыскін.

Чырвоная армія схіляе сёння свае баявыя сцягі перад прахам тых, хто яўляў сабою прыклад адвагі і смеласці.

Барацьба за заваяванне стратасферы не спыняецца. Вышэй сцяг барацьбы за перамогу чалавека над стыхіяй.

Ад імя МК ВКП(б), Мосаблвыканкома і Моссовета выступае тав. **Каміскі**.

— Гераічная смерць нашых трох таварышоў не можа ўнесці безнадзейнага суму ў нашы рады. Т.т. Федасеенка, Васенка і Усыскін змагаліся за навуку, за заваяванне стратасферы так, як трэба змагацца сынам социялістычнай бацькаўшчыны. Яны змагаліся пад сцягам Леніна і Сталіна, пад якім змагаюцца і перамагаюць комуністы ўсяго света.

Загінуўшыя таварышы падняліся на такую вышыню, да якой яшчэ не дабіраўся ў гісторыі нашай планеты ні адзін чалавек. Яны загінулі, але іх гераічны падзём у стратасферу застанецца адной з найвялікшых перамог нашай дзяржавы. Яны не былі толькі вучонымі даследчыкамі, яны былі барацьбітамі рабочага класа. Яны да апошняга ўздыхання абаранялі справу свайго класа.

Перамога першага стратастата і другія перамогі чалавека над стыхіяй, якія мы мелі ў нашай краіне — невыпадковы. Гэта плады заваяванняў першай пяцігодкі. Гэта — заваяванні, якія магчымы толькі ў краіне, дзе назаўсёды перамог рабочы клас.

Ад імя МК ВКП(б), Мосаблвыканкома і Моссовета схіляю галаву перад прахам паўчных таварышоў.

Праф. **Малчанаў** у сваёй прамове ўказвае, што загінуўшыя т.т. Федасеенка, Васенка і Усыскін апошнія два гады працавалі над стварэннем стратастата, рыхтуючыся да вывучэння стратасферы. Кожны радок іх запісаў, зробленых на працягу 7 гадзін палёту, гаворыць аб вялікай рабоце, праробленай т.т. Федасеенка, Васенка і Усыскіным для вывучэння стратасферы. Гэта работа, таўсцыць для совецкіх аэраістратанаўтаў вялікай зарукай для дасягнення яшчэ больш вышэйшых вышынь у стратасферы.

Камандзір першага стратастата «СССР» тав. **Пракоф'еў** гаворыць:

— Смерць унесла ад нас трох герояў — заваёўнікаў стратасферы. Але смерць не вырвала і не мягла вырваць таго, што яны далі чалавецтву. Яны прадаўжалі работу першага совецкага стратастата па наглядання і вывучэнню стратасферы. Яны працавалі як мужныя героі навукі і тэхнікі, яны вялі сваю работу паспяхова. І толькі трагічная смерць спыніла яе. Сотні запісаў — метэаралагічных, аэралагічных, баграфічных і інш. — вось што яны далі нам для вывучэння стратасферы.

За Совецкім Саюзам застаецца першынства заваявання паветра. Няхай нашых загінуўшых таварышоў сёння няма з намі, але яны праклалі нам шляхі для далейшага заваявання стратасферы.

Прашчай тав. Федасеенка! Прашчай Васенка! Прашчай Ільюша Усыскін!

Мы не плачам над вашым прахам. Мы рыхтуем дзесяткі і сотні новых герояў — даследчыкаў стратасферы. Лепшым помнікам для нашых трох таварышоў будзе заваяванне стратасферы. Зарукай у пасяховым завяршэнні гэтай справы — наша Комуністычная Партыя, наш вялікі Сталін.

Жалобны мітынг скончан.

Таварышы Молатаў, Каганові і Арджанікідзе знімаюць з пастамента урны і нясуць іх да Крэмлеўскай сцяны. Льюцца гукі жалобнага марша. У 16 гадз. 40 мінут урны замуроўваюцца ў Крэмлеўскай сцяне. Раздаецца трохразовы ружэйны развітальны салют, і зараз-жа плошча агалашаецца магутнымі гукамі «Інтэрнацыяналу», заклікаючымі да далейшых баёў і новых перамог социялістычнай рэволюцыі.

У ноч з 6 на 7 лютага ў 0 гадз. 30 м., згодна пастановы СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 10 студзеня 1934 г.

**АДБУДЗЕЦЦА**

**ўсебеларуская рэдчэй-канферэнцыя пазакладічка**

**па пытанню аб сакавічні плана мясазагатовак і-га квартала і плана вывазкі мяса Ленін раду.**

У справаздачнай пераказчыкі запрошаны ўдзельніка з персанальна: сакратары райкомаў, старшыні райвыканкому, нач. палітаддзелаў МТС, райсаўгасаў і ніх нікі зат тоучгаа вярт рабочых і міжрэённых аўтар „ЗАГОТСКОТ", а асобна тр ніцкія жыв жывёлы ў адзіночных р ёнаў.

# Тэлеграма з Канн (Францыя)

## Масква, XVII з'езд СТАЛІНУ

ПАЛКАЕ ПРЫВІТАННЕ! БЛІСКУЧЫ ДАКЛАД. ВЕЛІЧНЫ З'ЕЗД. ВЯЛІКАЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ПЕРАМОГА ПРАГУЧЭЛА ВЫШЭЙШЫМ ГОЛАСАМ НА ЎВЕСЬ СВЕТ.

АНРЫ БАРБЮС.

# Аб назначэнні пенсіі сем'ям т. т. Федасеенка, Васенка, Усыскіна, загінуўшых пры падзенні стратастата Асоавіяхіма Саюза ССР

## Пастанова Совета Народных Камісараў ССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляе:

Пазначыць сем'ям герояў, загінуўшых пры падзенні стратастата Асоавіяхіма Саюза ССР № 1 30-га студзеня 1934 года, пенсіі ў наступным размеры:

1. Сям'і т. Федасеенка П. Ф. у размеры 500 руб. у месяц, з 300 руб.—яго жонцы і дзіцяці да поўных год апошняга і 200 руб. — яго матцы Еўдакіі Федасеенка пажыццёва.

2. Сям'і т. Васенка А. Б. у размеры 500 руб. у месяц, з 300 руб.—яго жонцы і дзецям да поўных год малодшай дочкі 200 руб. — матцы Софіі Васенка пажыццёва.

3. Сям'і т. Усыскіна І. Д. у размеры 500 руб. у месяц, з 300 руб. яго бацькам пажыццёва і 200 руб.—сястры Софіі Усыскай да сканчэння ёю сельска-гаспадарчай акадэміі імя Тімірязева.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Кіраўнік справамі Совета Народных Камісараў Саюза ССР І. МІРОШНІКАЎ.

Масква. Крэмль.
2-га лютага 1934 года.

# АБМЕН ТЭЛЕГРАМАМІ ПАМІЖ ІСМЕТ-ПАША І тав. МОЛАТАВЫМ

СТАРШЫНІ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ П. МОЛАТАВУ
МАСКВА.

Толькі што даведаўся з пачуццём глыбокага жалю аб трагічным лёсе, спасцігшым стратастат «Асоавіяхім-1» у момант, калі ён заканчваў свой бліскучы палёт, заваяваўшы совецкай навуцы і шану ўсяго свету. Усім сэрцам падзяляю вашу жалобу па повадзе страты выдатных работнікаў навукі, загінуўшых у гэтай жудаснай катастрофе смерцю слаўных.

ІСМЕТ.

ЯГО ПРЭВАСХАДЗІЦЕЛЬСТВУ ІСМЕТ-ПАША, СТАРШЫНІ СОВЕТА МІНІСТРАЎ.

АНКАРА.

Глыбока расчулен вашай тэлеграмай спачування па поводу трагічнай гібелі нашых доблесных лётчыкаў. Прашу Вас прыняць мае шчырую падзяку за выказаныя Вамі пачуцці дружбы ў сувязі з цяжкой стратай, панесенай Совецкім Саюзам.

В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

# СПАЧУВАННІ ПА ПОВАДУ ГІБЕЛІ СТРАТАСТАТА „АСОАВІЯХІМ"

Паслы Турцыі, Італіі і Францыі, латвійскі пасол і кітайскі п[illegible] вераны ў справах выказалі народнаму камісару замежных спраў спачуванні па поводу гібелі стратастата «Асоавіяхім-1» і яго экі[illegible]пажа.

В. а. турэцкага міністра замежных спраў п. Шукры Ка[illegible] прыслаў на імя наркома замежных спраў тав. Літвінава тэлеграму з выражэннем спачування.

# ПАВЕДАМЛЕННЕ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 10 лютага ў 10 гадзін раніцы ў Прапойску будзе засяданьне Рэспубліканскай камісіі па разгляду апеляцый на пастановы Прапойскай і Чырвонапольскай райкамісій, наступных таварышоў:

**10 лютага ў г. Прапойску.**

Гарбатоў С. А., Палесіна П. Т., Шалухін А. М., Краўцоў А. К., Кобяк А. Я., Рудкоўскі В. Д. (Чырвонапольскі раён); Іохвід П. Р. (Прапойскі раён).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 8-та лютага г. г. а 10 гадзіне раніцы ў г. Камарыне будзе засядаць Рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый па рашэнні Камарынскай, Брагінскай і Хойніцкай райкамісій, наступных т. т.

Акенціц М. Н., Кузменко Е. М., Шайн Н. А., Бельчанко П. Ф., (Камарынскі раён); Власенко А. Я., Луцкі Х. Р., Мацчынскі В. А., Каплан М. А., Бондарцаў С. І. (Брагінскі раён); Міляўскі Б. С., Пуўленка І. Д., Хмялеўскі Г П., Булоўскі П. М., Тюлянко Э. Л., Акуленко А. С., Кастрома С. А., Хамжкоў Н. С., Панамароў І. А., Пілэк І. Д., Каліноўскі Ф. С., Чырвонпаў І. Я., Жукаў М. І., Яшковіч І. Ф., Юрчанка Л. Ф. (Хойніцкі раён).

**Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.**

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 9 лютага 1934 года, у 10 гадзін раніцы ў г. Чэрыкаве будзе засядаць Рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый на пастановы Чэрыкаўскай райкамісіі наступных таварышоў:

**8 лютага у г. Чэрыкаве.**

Макавецкая А. Н. Скробаў П. [illegible] Карнееў М. Н. Сычоў П. А. Варкоў Ф. В. Шурэў А. М. Зімоў А. Л. (Чэрыкаўскі раён).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б) паведамляе, што 6 лютага 1934 года у г. Жыткавічах будзе засядаць Рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый на пастановы Петрыкаўскай і Жыткавіцкай райкамісій, наступных таварышоў:

**6 лютага ў Жыткавічах.**

Пашук П. Я. Вінчук П. Ш., Хасо А. В., Ерамеў А. І., Хмялеўскі С. П. Кашыраўскі Е. Н., Яцко Н. І. Крож Ф. Ф., Навчанка Д. В., Фелістаў Ф. І., Міронович А. М., Кулоўіч Е. П. (Петрыкаўскі раён); [illegible] ройкін М. П., Цяплякоў В. Е. (Жыткавіцкі раён).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 2 лютага 1934 г. у г. Рэчыцы ў 10 гадзін раніцы адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай камісіі па разгляду апеляцый на рашэнні Лоеўскай раённай камісіі, наступных т. т.

Карпенка Е. П., Пінчук С., Зарая Я. К., Кукко А. Н., Шаш[illegible] Д. Ф., Лысенко Ф. Л. (Лоеў).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ

ВЫДАВЕЦТВА ЦК КП(б)Б „ПАРТВЫДАТ"

ВЫШЛА З ДРУКУ І ПАСТУПІЛА У ПРАДАЖУ БРАШУРА

І. В. СТАЛІН

АДЧОТ ЦК XVII З'ЕЗДУ ВКП(б)

64 стар. Тыр.80.000. ц. 35 к.

Брашуру распрадаюць у магазіне партыйнай кнігі (Совецкая, 61) і ва ўсіх кнігазінах дзяржаўнай сеткі ў раёнах.

Заказы накіроўваць—Менск, Карла Маркса, 14.

Заказы накладным плацежом не высылаюцца.

Рыхтуецца спецыяльны выдання адчота ЦК для малаграмотных.

Цана 5 кап. Заказы там-жа.

Дом комуністычнай асветы імя Ленина запрашае ўсіх на лекцыю (пакой 22, уваход з пуп. Энгельса) з 7 да 9 гадзін вечара праводзіцца

**кансультацыя па прапрацоўцы матэрыялаў XV беларускага і XVII ўсесаюзнага з'ездаў ВКП(б) Дом комасветы.**

Інстытут філасофіі Беларусі

5 лютага ў 7 гадз. адбудзецца абгаворванне дакладу тав. Выдрына „Аб метадалагічных пытаннях гісторыі Кастрычніка ў Беларусі"

Запрашаюцца інстытут гісторыі Беларусі і гісторыкі, а таксама навуковыя працаўнікі і выкладчыкі.

Дырэкцыя.

Калектыў супрацоўнікаў Гомельскага базіснага склада Белбродтэрста выказвае глыбокі жаль з прычыны смерці

тав. МОЎЧАНА Нікалая